Пралетарыі ўсіх краеў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў)

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 м. — 2 р. 70 к. На 6 м. — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. надбаўкі.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 к. Беспрацоўныя і чырвонаармейцы за дакумант 15 к. За кожны дадатковы 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 156 (2645) Чацьвер, 11-га ліпеня 1929 г.

IX гадавіна вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

У 9-Ю ГАДАВІНУ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ--ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПРАЦОЎНЫМ БССР.

НА ПАГРОЗЫ ВОРАГАЎ ПЕРАШКОДЗІЦЬ НАШАМУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ АДКАЖАМ УЗМАЦНЕНЬНЕМ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

ДА УСІХ РАБОЧЫХ, СЯЛЯН, ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І УСІХ ПРАЦОЎНЫХ БССР.

9 год таму назад пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу разам з рабочымі і сялянамі Беларусі, аб'яднаныя ў Чырвонай арміі, у партызанскіх атрадах, ачысьцілі захопленую польскімі імпэрыялістамі тэрыторыю Савецкай Беларусі і далі, такім чынам, магчымасьць разгортваньня сацыялістычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

9 год напружанай працы рабочых і сялян Савецкай Беларусі пры дапамозе працоўных усяго Савецкага Саюзу забасьпечылі не толькі адбудаваньне зруйнаванай імпэрыялістычнай вайною, акупантамі і бандамі нашу гаспадарку, але і паставілі яе на вышэйшую ступень. Беларусь з краю жабрацтва, нацыянальнага ўціску і культурнай цемры становіцца краінай, дзе працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяў пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў вялікім творчым захапленьні будуюць сваю сацыялістычную гаспадарку, сваю культуру. Расьце Асінбуд, будуюцца сотні новых фабрык і заводаў, расьце і калектывізуецца сельская гаспадарка; адчыніліся тысячы школ, працуюць Акадэмія Навук, Унівэрсытэт, Навукова-Дасьледчыя Інстытуты, тэатры, больніцы і санаторыі, расьце і квітнее беларуская культура і культура ўсіх нацыянальнасьцяй, што насяляюць Савецкую Беларусь.

Цьвёрдымі крокамі Савецкая Беларусь у цесным саюзе з іншымі Савецкімі Рэспублікамі ідзе наперад да сацыялізму. У рашучай клясавай бойцы на эканамічным і культурным фронце выбіваюцца з сваіх клясавых пазіцый ворагі—нэпман у горадзе і кулак у вёсцы.

Але-ж посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва будуць замацаваны толькі тады, калі кожны рабочы, кожны селянін і ўсякі, каму дорага справа сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ з большай рашучасьцю, яшчэ з большай упартасьцю сваім актыўным удзелам будзе дапамагаць гэтай справе.

Таварышы рабочыя і сяляне! Абвесьцім рашучую барацьбу прагульшчыкам, гультаям, п'яніцам і бюракратам, яшчэ больш рашуча павядзем наступленьне на прыватна-капіталістычныя элемэнты ў горадзе і вёсцы; шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва, зробім яго мэтадам усёй нашай працы, даб'ёмся праз яго канкрэтных вынікаў, зьнізім сабекошт і палепшым якасьць прадукцыі. Рашуча павядзем змаганьне з міжнацыянальнай варожасьцю, антысэмітызмам, шавінізмам і нацыянал-дэмакратызмам усіх колераў, замацуем брацкі саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяў, замацуем яшчэ больш наш саюз з брацкімі Савецкімі Рэспублікамі.

Таварышы рабочыя і сяляне! У творчым захапленьні будаўніцтва сацыялізму ні на хвіліну не будзем забываць, што імпэрыялісты ўсяго сьвету пры актыўнай дапамозе і ўдзеле сацыял-фашыстаў рыхтуюцца да новай вайны і ў першую чаргу вайны супроць Савецкага Саюзу. За кошт бязьлітаснай эксплёатацыі мільёнаў рабочых і сялян і прыгнечаных народаў калёній імпэрыялісты будуюць новыя браняносцы, паветраны флёт, рыхтуюць новыя газы. А таму працоўныя Савецкага Саюзу, дэманструючы сваю волю да міру, прапануючы канкрэтныя формы разбраеньня, ні на хвіліну не павінны забываць небясьпекі новай вайны. Будуючы сацыялістычную гаспадарку і культуру, будзем упарта і рашуча рыхтавацца даць ворагу ў выпадку нападу рашучы адпор. Узмоцнім нашу слаўную Чырвоную армію, дапаможам ёй у яе вучобе, узмацнім яе вайсковую моц, яшчэ мацней зьвяжамся з ёю. Станем усе ў шэрагі Таварыства Дапамогі авіяхіму, каб актыўным удзелам у працы яго забясьпечыць на выпадак нападу на нас, на наш тыл. Будзем памятаць, найлепшая падрыхтоўка кожнага працоўнага да абароны забясьпечыць наша мірнае сацыялістычнае будаўніцтва ад нападу.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Чырвоная армія вызваліла 9 год таму назад Савецкую Беларусь. Таварышы чырвонаармейцы! Памятайце слаўныя традыцыі Чырвонай арміі і моцна стойце на варце сацыялістычнага будаўніцтва, аўладайце ўсёй вайсковай тэхнікай, каб у патрэбны момант даць ворагу рашучы адпор.

Таварышы рабочыя, сяляне, чырвонаармейцы і ўсе працоўныя! У слаўную 9-ю гадавіну мы ня можам забыць аб нашых братох сялянах і рабочых Заходняй Беларусі, што енчаць у кіпцюрох польскага фашызму. Ім сёньня мы шлём свае братэрскае прывітаньне.

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!

Узмацнім наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі!

Няхай жыве магутны саюз рабочае клясы і працоўнага сялянства!

Няхай жыве моцны саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяў!

Няхай жыве Чырвоная армія—абарона працоўных!

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве Камінтэрн!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

ГАДАВІНА ВЫЗВАЛЕНЬНЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ.

З дапамогай рэвалюцыйнага расейскага пралетарыяту рабочыя і бяднейшыя сяляне пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў дні вялікага Кастрычніка скінулі ўладу паноў, капіталістаў і ўтварылі ў краіне Уладу Саветаў — дыктатуру пралетарыяту. Упяршыню ў гісторыі, пасьля Кастрычніка, Беларусь стала вольнай краінай, Савецкай дзяржавай, якая сёлета адсьвяткавала дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня. У ліку гэтых дзесяці—на працягу амаль году, значная частка тэрыторыі сучаснай Савецкай Беларусі знаходзілася пад акупацыяй польскіх паноў, якія ўчынялі крываваю расправу над рабочымі і сялянамі Беларусі. Гэтага часу польскага панаваньня, зьдзекаў над працоўнымі Беларусі рабочыя і сяляне і ўсе працоўныя масы ніколі не забудуць. Не забудуць таксама і таго, што розныя прадажніцкія

дзеячы так звана „беларускаі рады“ і іншыя, што знашлі сабе прытулак за межамі Савецкай Беларусі, якія разам з панамі, гандлярамі і ўсякімі нашымі ворагамі, пры дапамозе сусьветнага капіталу, разам з белабандамі, вялі барацьбу супроць Савецкай улады. Ня могуць забыць і не забудуць рабочыя і сяляне белапольскіх растрэлаў, катаваньне насельніцтва шампаламі і драцянымі бізунамі, няшчадных рэквізіцый, зьнішчэньня агнём шэрагу вёсак, мястэчак і зруйнаваньня шэрагу гарадоў. Бо ўсё тое, што прышлося бачыць і атрымаць ад польскай улады прывяло ня толькі рабочых і беднату вёскі, а і наогул працоўныя масы да заўзятай рашучай барацьбы з польскімі белабандамі да канчатковай перамогі. Гэтая барацьба была крывавай і бязьлітаснай, таму што абшарнікі і фабрыканты, якія страцілі ў дні Кастрычнікавай рэвалюцыі свае фабрыкі, землі і маёнткі, у хаўрусе з сусьветнымі драпежнікамі, рашылі з крывёю вырваць свае багацьці з рук рабочых і працоўнага сялянства Беларусі; яны імкнуліся аднавіць і замацаваць сваю ўладу, уладу абшарнікаў і капіталістаў. Адказам на белапольскі напад на краіну мірнага будаўніцтва маладой Савецкай Рэспублікі было масавае фармаваньне дабрахвотных партызанскіх атрадаў з лепшых сыноў рабочых і сялян Беларусі, якія і вялі рашучую барацьбу з арміяй „белага арла“ да поўнага вызваленьня Савецкай Беларусі.

Дзевяць год назад—11 ліпеня—Чырвоная Армія пры актыўнай дапамозе партызанскіх атрадаў заняла сучасную сталіцу Савецкае Беларусі Менск і ў хуткім часе ачысьціла ўвесь абшар Беларусі ад войск белапанскай Польшчы. Морам крыві, агнём пажараў, мукамі і сьмерцю сваіх найлепшых сыноў заплаціла Беларусь за сваё вызваленьне з-пад белапанскага крывавага прыгону. Вось чаму 11 ліпеня—дзень вызваленьня—у жыцьці БССР ніколі ня страціць сваёй урачыстасьці; ён не перастане абуджаць у сэрцы кожнага рабочага, кожнага селяніна найлепшых, радасных, сьветлых пачуцьцяў. Гэты дзень гэраічнага вызваленьня нашай краіны з-пад польскага панства зьяўляецца днём, пачынаючы ад якога сярмажная Беларусь, загойваючы свае крывавыя раны, усімі сіламі і сродкамі, пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі, вядзе справу будаўніцтва сацыялізму. Цяжкую спадчыну атрымала Савецкая Беларусь ад мінулага наогул; асабліва-ж шырокую і глыбокую крывавую баразну пакінула ў БССР нячуваная жорсткая белапольская акупацыя.

Адзначаючы сёньня малюнак поўнага разбурэньня і запусьценьня Беларусі, вышаўшай дзевяць год таму назад з-пад белапольскай акупацыі, робячы параўнаньні з тымі дасягненьнямі, якія мы маем зараз, мы можам з гонарам сказаць, што пралетарыят і працоўныя масы Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам нашай партыі значна залячылі раны мінулай спадчыны і вышлі на шырокі шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Правільна вырашанае партыяй і савецкай уладай нацыянальнае пытаньне абудзіла энэргію і здольнасьць працоўных мас усіх нацыянальнасьцяў, адчыніла дзьверы поўнай магчымасьці ўдзелу іх у сацыялістычным будаўніцтве. У той час, як у буржуазных дзяржавах праводзіцца палітыка эксплёатацыі і прыгнечаньня слабейшых, меншых нацыянальнасьцяў, у той час, як беларускае насельніцтва за межамі Савецкага Саюзу падвяргаецца эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму прыгнечаньню,—у Савецкім Саюзе, у Савецкай Беларусі працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяў карыстаюцца роўнымі правамі ва ўсіх галінах культурнага, нацыянальнага і эканамічнага разьвіцьця. Кожнай нацыянальнасьці рознымі спэцыяльнымі мерапрыёмствамі савецкай улады і штодзённай практычнай працай саветаў забясьпечваецца поўная магчымасьць эканамічнага і культурнага разьвіцьця. Савецкая Беларусь мае на сваёй тэрыторыі досыць школ, розных культасьветных установ, а таксама савецкіх і грамадзкіх органаў, якія ў мясцох большасьці насельніцтва нацменшасьцяў вядуць працу на іх роднай мове. Працоўныя нацменшасьцяў БССР на сваіх зьездах і канфэрэнцыях ня раз заяўлялі, што толькі ў БССР, як і ва ўсім Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, на падставе дыктатуры пралетарыяту, забясьпечана права на палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьцё працоўных усіх нацыянальнасьцяў. Савецкая Беларусь у галіне правядзеньня нацпалітыкі і беларусізацыі, культурна-гаспадарчага абслугоўваньня нацменшасьцяў, будаўніцтва нацыянальнай савецкай культуры і эканомікі да дзявятай гадавіны свайго вызваленьня мае вялізарнейшыя посьпехі.

Беларуская прамысловасьць значна перавысіла даваенны ўзровень; будаўніцтва фабрык і заводаў, якое пашыраецца і паляпшаецца ў Беларусі, узмацняе кіруючую ролю пралетарыяту ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, павялічвае сацыялістычны сэктар і ўдзельную яго вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы, і наша прамысловасьць усё больш і больш забясьпечвае патрэбы сваімі фабрычнымі прадуктамі, патрэбы працоўнага насельніцтва. Такія факты, як напрыклад, будаўніцтва раённай электрастанцыі імя т. Сталіна, гавораць аб тым, што Савецкая Беларусь разам з Савецкім Саюзам праз некалькі год з аграрнай стане індустрыяльнай краінай. Паляпшаецца сельская гаспадарка, асушаюцца і ператвараюцца ў нівы дзесяткі тысяч гэктараў забалочаных зямель. Сотні тысяч сялянскіх двароў аб'яднаны ў розныя віды каапэрацыі. Расьце сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы, узмацняюцца саўгасы, магутнай хваляй разгортваецца калгаснае будаўніцтва.

На падставе эканамічнага разьвіцьця пашыраецца і паглыбляецца савецкая беларуская культура, культура працоўных усіх нацыянальнасьцяў. У краіне, дзе ня было ніводнае беларускае школы, утвораны тысячы новых школ, у якіх дзеці рабочых і сялян вучацца на сваёй роднай мове. Дзе ня было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, сёньня маем шэраг сярэдніх і вышэйшых школ, а таксама дасьледчых інстытутаў і такую ўстанову, як Беларуская Акадэмія Навук. Няма патрэбы падрабязна пералічваць сёньня ўсе нашы дасягненьні. Рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя Савецкай Беларусі, непасрэдна ўдзельнічаючы ў сацыялістычным будаўніцтве, самі бачаць і адчуваюць нашы дасягненьні. Шмат цяжкасьцяў пераможана, але іх яшчэ ня менш наперадзе. Нам трэба як мага больш будаваць новыя фабрыкі і заводы, перамагаючы адсталасьць і слабасьць нашай тэхнікі. Рэканструіраваць сельскую гаспадарку, аб'яднаць у калгасы раздробленую мелкую індывідуальную гаспадарку вёскі, гаспадарча дапамагаць беднаце. Перамагчы нашымі эканамічнымі мерапрыёмствамі рашучага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі—кулака і нэпмана. Палепшыць і разгарнуць працу саветаў і грамадзкіх арганізацый на падставе ажыцьцяўленьня прынятага пяцігадовага пляну вялікага сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ больш разгортваць культурную рэвалюцыю, зьнішчаючы грубасьць п'янства, хуліганства і астаткі барбарства ў быце. Уцягнуць у сацыялістычнае будаўніцтва новыя кадры рабочых, батракоў, бедноты і серадняцкага актыву; ачысьціць савецкі апарат ад злачынцаў і бюракратаў, палепшыць абслугоўваньне працоўных мас. Усе гэтыя задачы мы ў БССР з дапамогай Саюзу ССР бязумоўна вырашым і цяжкасьці пераможам. Парука гэтаму—геніяльнае кіраўніцтва нашай партыі і адна з яе найлепшых мер—сацыялістычнае спаборніцтва, у якім удзельнічаюць міліённыя масы рабочых і сялян.

Аднак, пры вырашэньні задач мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, асабліва сёньня—у дзень сьвята дзявятай гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, мы павінны ведаць і памятаць тую бязупынную падрыхтоўку вайны супроць СССР, якая вядзецца сусьветнай капіталістычнай буржуазеяй. Нам трэба памятаць, што на БССР, якая знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным сьветам, ляжыць задача асабліва востра сачыць за спробамі імпэрыялістаў пачаць новы напад на нашу краіну. Нам трэба яшчэ больш узмацняць абараназдольнасьць краіны, каб быць падрыхтаваным у патрэбную хвіліну ўсім устаць на абарону Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Нам трэба ў дзесяткі разоў павялічыць клопаты аб нашай слаўнай Чырвонай Арміі, якая была і будзе лепшым сродкам абароны краіны Саветаў у барацьбе за сусьветны Кастрычнік.

Няхай ведаюць паны і капіталісты, што наша падрыхтоўка да абароны зьяўляецца адказам на сабатаж прапаноў Ураду Саюзу ССР аб усеагульным разбраеньні, на тую шалёную падрыхтоўку да вайны з боку імпэрыялістычных дзяржаў супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетарыяту—Саюзу ССР. Мы імкнуліся і заўсёды імкнемся да міру, але стаялі і будзем цьвёрда стаяць на варце абароны межаў Савецкага Саюзу.

Вядучы падрыхтоўку да абароны нашай краіны, мы ўпэўнены, што ў вайне, якую рыхтуюць супроць нас капіталісты, пераможцай, з дапамогай сусьветнага пралетарыяту, будзе наша слаўная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія

А. Хацкевіч.

„ПАНЫ, СУДЗІЦЬ ВАС БУДЗЕМ МЫ!“

Раніца была самая звычайная. Раніца, узбуджаная гулам гармат, енкам параненых і паміраючых у бойцы людзей.

Такая раніца будзіць Менск трэція суткі ўзапар у чэрвені 1920 году.

Лета. Гарачы час. Менск мімавольна апрануўся ў стракатую, а месцамі пераважна ў белую вопратку. Белую дарагую—з пер'я пасечаных падушак, розных папер і іншых хатніх рэчаў.

Менск, цывільны Менск—у той час горад старыкоў, дзяцей і жанчын—прабіраюць дрыжыкі.

Людзі ходзяць ценямі, туляюцца, дзе хто можа. Над галовамі ні ў чым не павінных людзей гуляе сымбалічны вобраз сьмерці, з даўжэзнай касой.

Узмах касы—і сьвежыя, цёплыя, акрываўленыя трупы ляжаць на вуліцах Менску: Замкавай, Савецкай, Інтэрнацыянальнай, Пралетарскай, на Ніжнім рынку... Усюды забітыя людзі...

Усюды польскія жаўнеры ладзяць крывавы баль. Апошні крывавы баль.

На пляцу Волі, каля Ленінскай, ляжыць распластаны чалавек—самы звычайны. Рабочая кепка, зьбітая прыкладам, скалечаная ляжыць у браме; з-пад фартуха, запэцканага ў аліву і сажу, відаць сінюю палатаную кашулю; мускулы на шыі ўздуліся; з грудзей чырвоным шнурком струменіць кроў. Кроў чырвонай істужкай плыве па гарачаму асфальту далей і далей, капае запечанымі згусткамі ў рыштох, у ваду мутную, забруджаную...

На губах мёртвага чалавека, на губах трупа—застыла ўсьмешка... Губы нібы пытаюць: „За што?..“

Ну, забілі і проста, але пашто зьдекавацца?..

Пашто было пад рогат дзесяткаў харунжых, плютуновых, капралаў і пад агідна злоснае хіхіканьне правакатараў (здраднікаў) прымушаць сьпяваць пахабныя сьпевы?...

Але воля пакутніка была мацнейшай. Харунжыя не дачакаліся жаданых сьпеваў. Затое чалавек памёр, сьпяваючы «Інтэрнацыянал».

Хрып грудзей і не сьцярпімая боль шкодзілі запець звонка галасна. Ён нэрвова камечыў падол фартуха і пальцамі затыкаў крывавую рану ў грудзёх. Ён утаптаў туды палову фартуха, але прапяяў сваё любімае—„Інтэрнацыянал“.

Ён прапяяў і памёр з усьмешкаю зброяй для чалавечага існаваньня—малатком, напільнікам.

Гэта быў Мікола.

Мікола, які з прастрэленымі грудзямі крычаў: «Паны, судзіць вас будзем мы!»

За гэта куля харунжага расчапіла чэрап.

На ілбу пяцікутовай зьвяздой запяклася кроў і застылі ў вечнай усьмешцы вусны.

Лякавы бот капітана з сілай урэзаўся ў бок мертвага Міколы; здраднік ткнуў у рот забітага недагарак абсмоктанай бруднай, засьлюненай цыгарэты...

Вясёлая кампанія павярнулася і пашла з рогатам, з шалёным рогатам балюючага панства...

* * *

Ня ўсе чынілі зьдзекі, ня ўсе жаўнеры польскай арміі такія каты!

Адзін з іх моцна ўрэзаўся ў маю памяць.

Яго звалі проста—„Антэк»... Яму надзвычайна падабалася чырвонаармейская кашуля, яму падабаўся блізкі, родны молат і серп і чырвонаармейская зьвязда.

Ён праз адну бабулю ўвесь паёк свой аддаваў палонным чырвонаармейцам.

Яго куля не ляцела ў той бок, дзе быў чырвоны змагар; яго звычайны ангельскі бот ня ўрэзваўся ў бок Міколы.

Ён казаў проста.

— Не, ня буду страляць у чырвонаармейца.

Яму я не даваў жыцьця і адбіраць не магу. Затое ён і я—мы разам—жыцьцё панам далі і прыдзе час—мы адбяром яго...

Я памятаю; ён супыніўся каля Міколы, выняў брудную цыгарку, зачыніў шчыльна скроні, сарваў белы «ажолак» з чатырохкантовай шапкі і кінуў у бок.

Ён доўга глядзеў у сьлед „вясёлай“ бяз конца кампаніі. Вочы яго палалі. Ён павярнуўся і пашоў у другі бок, бліжэй да гулу гармат, пашоў туды, дзе няма зьдзекаў, няма паноў...

„Антэк“ на ўзгорку азірнуўся ў апошні раз і грозна крыкнуў у здагон кампаніі:

„Надыйдзе час расплаты! Паны, судзіць вас будзем мы!“

Нашы дасягненьні ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Сёньня мы сьвяткуем дзевятую гадавіну вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапольскіх акупантаў. Дзевяць гадоў у гісторыі таго ці іншага народу пэрыяд параўнальна не асабліва вялікі, але гэты пэрыяд, які перажылі працоўныя БССР, залатымі літарамі будзе ўпісаны ў гісторыю нашай краіны. Беларусь прыгнечаная вякамі сацыяльна і нацыянальна, Беларусь залітая крывёю і сьлязьмі рабочых і сялян асабліва ў час белапанскай акупацыі і імпэрыялістычнай вайны, з разбуранаю ўшчэнт гаспадаркаю, з спаленымі заводамі і фабрыкамі, з зрытаю акопамі зямлёю за дзевяць гадоў мірнай працы ня толькі аднавіла сваю гаспадарку, але і будуе сацыялізм у вольным Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Працоўныя Савецкай Беларусі могуць ганарыцца сваімі посьпехамі ў гаспадарча-культурным будаўніцтве ў дзень сьвята вызваленьня. Пры брацкай дапамозе з боку СССР, Савецкая Беларусь будуе новыя фабрыкі і заводы, праводзіць калектывізацыю і машынізацыю сельскай гаспадаркі і ўздымае культурны ўзровень шырокіх ко- вялізарнейшаю працаю, мы часта праходзім міма тых дасягненьняў, якія маюцца ў нас, не прыкмячаючы іх.

Адзіна правільная нацыянальная палітыка камуністычнай партыі і савецкай улады ўтварыла мірнае братэрскае сужыцьцё ўсіх нацый, якія жывуць на тэрыторыі БССР. Партыя і пралетарыят узмацняюць і разьвіваюць савецкую дзяржаўнасьць, якая цалкам і поўнасьцю адпавядае нацыянальна-бытавым умовам Беларусі і задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Нашы органы ўлады і гаспадаркі прыстасаваны да запатрабаваньняў і абслугоўваньня насельніцтва ўсіх нацый БССР на іх роднай мове. Для замацаваньня саюзу рабочай клясы і сялянства, забясьпечаньня пралетарскага зьместу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве для належнага абслугоўваньня шырокіх колаў насельніцтва праводзіцца на працягу шэрагу гадоў беларусізацыя партыйных, савецкіх і прафэсыянальных як цэнтральных, так і мясцовых установ.

Савецкія ўстановы, якія абслугоўваюць сялянства, цалкам беларусізаваны, тое самае магчыма сказаць і ад- ларусізацыя па асобных тыпах гэтых установ праведзена на 100 пр. Разам з беларусізацыяй вялікая ўвага зьвяртаецца і на забясьпечаньне культурных запатрабаваньняў нацменшасьцяў. Для нацменшасьцяў арганізавана шырокая сетка школ, палітасьветных установ, арганізаваны нацыянальныя саветы, якіх ёсьць 55, нацыянальныя суды і г. д. Усё гэта сьведчыць аб тым, што нацыянальная палітыка Кампартыі і савецкай улады практычна ажыцьцяўляецца ў інтарэсах усіх нацыянальнасьцяў, якія жывуць на тэрыторыі БССР. Недарма на нядаўна адбыўшыхся зьездах працоўных палякаў і працоўных яўрэйскіх мас гэтыя дасягненьні дэманстравалі самі працоўныя масы, недарма працоўныя нацменшасьцяў называюць савецкую краіну адзінай бацькаўшчынай.

У сучасны момант вялізарнейшыя сродкі выдаткуюцца дзяржаваю на культурнае будаўніцтва. Досыць сказаць, што замест 15 міліёнаў руб., якія выдаткаваліся на справу асьветы ў сучаснай валюце да вайны, мы цяпер выдаткуем 31 міл., каб уявіць сабе той вялізарнейшы размах у справе часны момант шэраг ВНУ, Беларускую Акадэмію Навук, шэраг навукова-дасьледчых інстытутаў, некалькі дзесяткаў тэхнікумаў. Гэтыя навуковыя і навучальныя ўстановы разгортваюць вялікую працу па ўздыму вытворчых сіл краіны, па падрыхтоўцы спэцыялістаў для гаспадарча-культурнай працы. Дзякуючы падтрыманьню саюзнага ўраду мы ў хуткім часе будзем мець лепшыя памяшканьні для нашага БДУ, пабудаваныя па апошняму слову тэхнікі.

Беларусь некалькі гадоў таму назад мела надзвычайна вялікі лік няпісьменных. Дзякуючы шырокай сетцы лікпунктаў, разьвіцьцю грамадзкасьці вакол гэтага пытаньня, лік няпісьменных з кожным годам зьмяншаецца. У 1920 г. на 1000 ч. было пісьменных 327, у сучасны момант лік пісьменных дасягае да 450 чал. нават у адсталых частках нашай краіны. Наша школьная сетка з кожным годам пашыраецца. Ёсьць шэраг гарадоў, мястэчак, вёсак, дзе ўведзена ўжо ўсеагульнае і абавязковае навучаньне. Такім чынам, пашыраючы кожны год сетку школ, мы будзем ахапляць усё большую і большую колькасьць сельсаветаў, раёнаў, гарадоў і мястэчак, дзе будзе ўводзіцца ўсеагульнае і аба-

Значна расьце наша выдавецкая справа. Кніжка, газэта, часопіс укараняецца ў самых глухіх мясцох Беларусі. Вельмі частае зьявішча, калі пастуха можна бачыць з кніжкаю на полі. Гэта гаворыць аб вялікім культурным уздыме сярод працоўных. Аб нашым выдавецтве досыць прывесьці адну лічбу—25 міліёнаў аркушаў будзе выдадзена ў гэтым 28-29 гаспадарчым годзе беларускай літаратуры, значная колькасьць яўрэйскай і польскай, каб упэўніцца ў тым, што „спажывец» наш мае вялікі попыт на кніжку. Нашы тэатры таксама маюць значныя дасягненьні ў абслугоўваньні працоўных мас.

Такім чынам, мы маем буйны рост як культуры беларускай нацыі, так і культуры нацменшасьцяў. Гэта фактары правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў Савецкай Беларусі. Адзначаючы нашы дасягненьні ў дзень дзявятай гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў, мы ня можам абыйсьці моўчкі тых зьдзекаў, катаваньняў, катаржных прысудаў, якія маюць месца ў Заходняй Беларусі над працоўнымі масамі. Шляхам жорсткага тэрору і пагромаў паны імкнуцца зьнішчыць масавы пратэст працоўных супроць сацыяльна - нацыянальнага

НА РУІНАХ БУДУЕМ САЦЫЯЛІЗМ.

ШПАРКА РАСЬЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, ПЕРАБУДОЎВАЕЦЦА НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЛАД СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА, УЗДЫМАЕЦЦА ЎРАДЖАЙНАСЬЦЬ, ШЫРЫЦЦА КУЛЬТУРА СЯРОД ПРАЦОЎНЫХ, РАСЬЦЕ І ЎЗМАЦНЯЕЦЦА КААПЭРАЦЫЯ.

СССР---СЬЦЯГ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ ПРЫГНЕЧАНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ.

Прамысловасьць расьце.

(Гутарка з нам. старшыні ВСНГ БССР тав. Баль).

Рабочая кляса і працоўнае сялянства сваёй упартай воляй аднавілі ўсю народную гаспадарку, зруйнаваную белапалякамі, паставіўшы на першы плян разьвіцьцё буйнай прамысловасьці.

Адсталасьць прамысловасьці БССР, аграрная перанаселенасьць і значнае беспрацоўе ў гарадох і мястэчках патрабуюць у бліжэйшае 5-цігодзьдзе фарсыраваць прамысловае будаўніцтва, узмацніць інтэнсыфікацыю сельскай гаспадаркі і яе таварнасьць.

За мінулае 5-цігодзьдзе мы мелі буйны рост прамысловага будаўніцтва. Лічбы паказваюць, што за гэты час прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ўзрасла на 230 проц. Па гадох рост гэты быў наступны: у 1923-24 г.—на 33 проц., у 1924-25 г.—на 52 проц., а ў 1927-28 г. на 100,1 проц.

Акрамя гэтага, адбывалася будаўніцтва новых буйных фабрык і заводаў, як, напрыклад, заводы „Бальшавік" і „Энэргія", «Меншвэй», буйны завод па вырабу с.-г. машын і цэлы шэраг інш. фабрык і заводаў.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што мы шпаркім тэмпам ідзём у галіне прамысловасьці і павялічваем сацыялістычную базу ў Савецкай Беларусі.

Новае 5-цігодзьдзе, якое зьяўляецца плянам вялікіх работ, патрабуе ад усіх працоўных напружанасьці, мы павінны максымальна зьнізіць сабекошт, павялічыць вытворчасьць працы, **каб у працягу 5 год павялічыць рост валавай прадукцыі на 377 проц., рост вытворчасьці працы—на 100 проц. і г. д.** Рост сродкаў на палепшаньне быту і матар'яльнага становішча павінен павялічыцца на 32 проц. у параўнаньні з 1927-28 г.

Ня менш увагі зварачваецца і на электрыфікацыю. На 5-годцы на электрыфікацыю народнай гаспадаркі намечана 77.000.000 руб.

Савецкая Беларусь, якая ўвесь час была заняпалай краінай, вышла на новы сацыялістычны шлях, шпарка адбудоўвае ўсе галіны гаспадаркі, індустрыялізуе сваю прамысловасьць і сельскую гаспадарку, ідзе па шляху калектывізацыі вёскі. З кожным годам мы маем усё новыя і новыя дасягненьні.

Усе мерапрыёмствы, якія вызначаны 5-гадовым плянам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будуць выкананы працоўнымі БССР. **Я. З.**

Адчыняем швэйную фабрыку.

(г. Магілеў).

Сёньня, 11 ліпеня, у гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, Магілеў сьвяткуе адкрыцьце вялікага ў горадзе прадпрыемства—швэйнай фабрыкі Белшвэйтрэсту, з лікам рабочых каля 500 чалавек.

Як і іншым прадпрыёмствам Белшвэйтрэсту, новай фабрыцы вызначана свая спэцыяльнасьць—выраб мужчынскіх зімніх паліто і паўпаліто, з вытворчай праграмай на выпуск штодня 120 штук першых і 350—другіх.

Пад майстэрні адведзены двохпавярховы будынак б. магілеўскага працкалектыву швэйнікаў, будынак у працягу месяца адрамантаваны, на што выдаткавана 10.000 руб.; нажаль, частку майстэрняў, з-за цеснаты, прышлося зьмясьціць у другім будынку (праз вуліцу), дзе таксама зьмяшчаецца склад матар'ялаў і гатовай прадукцыі.

Мы гарантаваны ад тых „страт вытворчасьці", якія былі няўхільны з пачатку работ у Віцшвэі і Меншвэі,—

На будаўніцтве трамваю.

З самага пачатку работа на новай фабрыцы пойдзе па канвэйеру. Выраб паліто падзелены на 75 апэрацый (па 5 хвілін кожная) і паўпаліто—на 103 апэрацыі (па 2 хвіліны).

Канвэйер дае мажлівасьць скарыстаць малакваліфікаваных рабочых: калі ў працкалектыве сярэдні разрад, на які прыпадала палавіна ўсіх рабочых, быў шосты, дык на фабрыцы найвялікшая большасьць рабочых будзе роўная па кваліфікацыі трэцяму разраду.

Канвэйерная сыстэма вельмі значна зьніжае расходы на зарплату: у працкалектыве пры разьдзяленьні працы пашыцьцё зімняга паліто выдаткоўвалася на зарплату каля 6 руб. і на паўпаліто—2 руб. 75 кап., на фабрыцы пры канвэйеры (пры ўмове, што сярэдняя зарплата рабочаму ня зьнізіцца супроць тэй, якая была ў працкалектыве) паказаныя лічбы зьніжаюцца адпаведна да 3 руб. 06 кап. і 1 руб. 35 кап.

бо з гэтых апошніх мы маем на магілеўскай фабрыцы арганізатараў і найлепшых майстроў—закройшчыкаў.

У першыя часы мы па зразумелых прычынах (пакуль штат рабочых не прызвычаіцца да працы) ня здолеем выконваць нармальную вытворчую праграму; закройныя машыны атрыманы; але пакуль-што будзем працаваць на старых машынах (працкалектываў) і з ножнымі прывадамі, пакуль не атрымаем новыя машыны і ня зробім да іх трансмісіі, што будзе прыблізна праз паўгода.

На фабрыку ўліты рабочыя працкалектываў—магілеўскага, шклоўскага, аршанскага, дубровенскага і клімавіцкага, рэшта—набрана праз біржу працы, на якой узяліся на вучот шмат прыежджых з іншых гарадоў краіны, у надзеі паступіць на новую фабрыку; прыежджым, асабліва сямейным, цяжка знайсьці ў Магілеве кватэры, няма памяшканьня для клюбу і г. д. **Квік.**

Савгасы да 9-й гадавіны вызваленьня Беларусі.

Разбураныя, спаленыя будынкі, уведзены абшарнікамі жывы інвэнтар, ні хунта насеньня—гэта спадчына, якую атрымалі рабочыя ў большасьці маёнткаў паальля белапалякаў. На гэтай базе—з парай каросьлівых коняй, з гэтымі „струмэнтамі" выкліканыя Кастрычнікам творчыя сілы рабочых тварылі першыя перамогі,—стваралі матар'яльную базу, каб зрабіць з савгасаў узорную буйную сельска-гаспадарчую вытворчасьць.

К 9-й гадавіне ёсьць аб чым успомніць будаўнікам савгасаў.

Гісторыя разьвіцьця іх—ёсьць частка слаўнай гісторыі разьвіцьця усёй народнай гаспадаркі. Упартай воляй рабочых калектываў,—пад правільным кіраўніцтвам кампартыі, савгасы дасягнулі буйнейшых посьпехаў. Толькі за апошнія тры гады ўзрасьлі асноўныя капіталы на 71 проц., валавая прадукцыя на 94 проц. і таварная на 95 проц. Адноўлены разбураныя і пабудаваны 93 новыя тэхнічныя прадпрыёмствы па перапрацоўцы бульбы і малака. Штогодна ўзмацняецца праца іх і на ахопу сялянскай сыравіны.

З гэтага году савгасы павінны даваць вялікую колькасьць гатунковага насеньня. У вясеньні сеў пад гатунковым аўсом занята 93 проц., ячменем 97 проц. і бульбай 60 проц. У асеньні сеў мяркуецца ўсе 100 проц. плошчы заняць гатунковымі культурамі. Асобныя савгасы паказваюць прыклады высокай ураджайнасьці,— дэманструючы гэтым шляхі як дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны. Вось некалькі прыкладаў: 1928 г. Па аўсу Сеньніца 15 цэн., Барысаўшчына 17,5 цен., Станіслава—18,5 цэн., Зазерра 19,7 цэн. Па жыту Ачэса-Рудня, Сьвіслач 15 цэн.; Сеньніца, Бялевічы 17 цэнт., пры сярэдніх па аўсу 9,5 цэн. і 8 цэн. па жыту. Ня горшыя вынікі ёсьць і па удойнасьці асобных стад савгасаў.

Штогодна ўзрастае аграўвытворчая дапамога бядняцка-серадняцкаму сялянству. Упяршыню савгасамі арганізавана 13 калектыўна-каапэрацыйных аб'яднаньняў, узята шэфства над вакольнымі пасёлкамі,—вёскамі. За час вясеньняй саўбы праведзена 991 сялянская нарада па пытаньнях сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. У два ў тры і больш разы



Будынак Цэнтральнай Малочнай (Менск).

павялічылася рэальная аграўвытворчая дапамога па рамонту машын, зернаачыстцы, па забясьпечаньню вытворнікамі, абмене палепшанага насеньня і перадачы каапэрацыі гатунковага. За гады існаваньня савгасаў значна палепшылася і матар'яльнае забясьпечаньне рабочых. За 1926—28 г. г укладзена 400.922 руб. 72 к. у жыльлёвую гаспадарку савгасаў.

Разам з буйнымі посьпехамі ёсьць яшчэ і шмат недахопаў. Яшчэ дрэнна арганізаваны савгасы, недастаткова ўкамплектаваны сродкамі вытворчасьці. Выключна небясьпечным зьяўляецца пытаньне з кіраўнічымі кадрамі. Высокі сярэдні сабекошт прадукцыі і г. д.

Аглядаючы пройдзены шлях, прэвяраючы дасягненьні і недахопы, трэба цьвёрда памятаць, што рашучая сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй сельскай гаспадаркі ўскладае на савгасы новыя задачы і тэмпы іх ажыцьцяўленьня.

Савгасы павінны хутчэй стаць на справе сапраўднымі энэргетычнымі і с. г. індустрыяльнымі цэнтрамі. А гэта патрабуе ня толькі пашырэньня будаўніцтва тэхнічных прадпрыёмстваў, і ва ўмовах Беларусі праз арганізацыю машынна-трактарных станцый і калён, электраматораў,—шпарчэй мэханізуючы вытворчыя працэсы ў савгасах праз іх-жа будуць будаваць — **буйнейшыя** с. г. фабрыкі з дробных сялянскіх гаспадарак. Савгасы павінны быць фабрыкамі гатунковага насеньня, тэхнічных культур, племянной жывёлы. Гэта патрабуе шэрагу канкрэтных мер і ў першую чаргу максымальна хуткага ўкамплектаваньня жывёлай. Вакол гарадоў і рабочых цэнтраў трэба ня толькі ўтварыць новыя агародна-малочныя савгасы—але і ў старых шырока разьвіць гэтыя галіны.

Савгасы павінны быць узорамі найвышэйшай вытворчасьці працы прыкладамі лепшай якасьці прадукцыі і мінімальнага сабекошту, яшчэ больш актыўнымі рэарганізатарамі бядняцка-серадняцкага сялянства па шляху калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня і ўздыму прадукцыйнасьці. Гэта асноўныя задачы, якія стаяць перад савгасамі. Пад гэтым кутом погляду павінна прайсьці 9-я гадавіна вызваленьня Беларусі ад белапалякаў у савгасах.

Аўчынікаў.

Буйны рост каапэрацыі

(Бабруйская акруга).

Ідзе шпаркім тэмпам перабудова гаспадаркі Бабруйшчыны на аснове шырокай калектывізацыі, каапэраваньня, узмацненьня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Лічбы гавораць аб тым, што бядняцка-серадняцкая частка вёскі шырокаю хваляю ўліваецца у каапэрацыйныя аб'яднаньні.

Калі мы возьмем становішча нашых калгасаў у акрузе пару гадоў таму назад, дык лік калгасаў быў каля 5-6. Цяпер на Бабруйшчыне існуе 185 калгасаў. У гэтым годзе асабліва шырока разгарнулася калгаснае будаўніцтва ў акрузе. Яно дало 77 новых калгасаў і галоўнае, некалькі буйных, якія налічваюць у сабе да сотні членаў і займаюць да 1000 гэктараў зямлі. Яшчэ ў 1926 годзе на Бабруйшчыне ня было ніводнай камуны. Цяпер іх у акрузе налічваецца чатыры.

Бядняцка-серадняцкае сялянства ідзе ў калгасы з ахвотаю. Да восені бягучага году ў акрузе лік калгасаў мяркуецца давесьці да 215. Гэтыя калгасы будуць займаць 28 тысяч гэктараў зямлі.

Становішча вытворчай сельска-гаспадарчай каапэрацыі да IX гадавіны вызваленьня Беларусі характарызуецца наступнымі лічбамі. Толькі за адзін апошні год лік вытворчых аб'яднаньняў павялічыўся ў акрузе на 40 проц. і лік пайнікаў на 90 проц. Усе віды вытворчай каапэрацыі арганізацыйна аформіліся. Арганізаваны малочна-жывёлаводны саюз. У хуткім часе будзе арганізован садова-гародны саюз. У вытворчую каапэрацыю каапэравана 50 проц. ліку бядняцкіх гаспадарак акругі. Прыбыткі па таварыствах за апошні толькі год складаюць 70 тыс. руб.

У галіне малочнай каапэрацыі Бабруйская акруга можа пахваліцца наладжваньнем гэтай працы і прыданьнем сваім малочным таварыствам правільнага напрамку ў працы. Калі ў мінулым нават годзе было шмат таварystw, якія лічыліся толькі на паперы, дык цяпер гэтага няма.

У акрузе працуюць 62 таварыствы, якія аб'ядноўваюць 6879 пайнікаў. Павялічыўся паявы ўзнос у малочнай каапэрацыі. Таварыствы пайшлі па шляху паляпшэньня пароды жывёлы шляхам адчыненьня злучных пунктаў, такіх пунктаў у акрузе ёсьць зараз 48. Шмат жанчын (болей 300) уцягнута ў малочную каапэрацыю за апошні час. Таварыствы закладваюць паказальныя вучасткі з пасевам карняплодаў для харчаваньня жывёлы. ... пайшчыкаў гэтай каапэрацыі ... тысяча беднякоў, якія ... кошт фонду беднаты.

З году ў год шпаркім ... гортваецца праца спажывецкай ... цыі ў акрузе, кожны год дае ... вых пайнікаў, дзесяткі і тыс... паявых капіталаў. Зварот толь... закупках тавараў за апошні ... чыўся на 28 проц. І ўжо гэта ... казвае наколькі наша спажы... апэрацыя разгортвае сваю пра... дзены лік пайшчыкаў да 67 ты... нута ўкладаў на 48 тыс. руб... лічыўся зварот, усё гэта гавор... сягненьнях спажывецкай каап... шай акругі.

Разам з гэтым разгортваецца ... на-масавая праца.

У бягучым годзе значна ... сетка крам у горадзе. Многія ... шырылі свае аддзелы. Апрача ... рабкоп за апошні год зьнізіў ... на тавары. Значна павялічыліся ... сродкі Цэрабкопа і дасягнулі ... годзе да 146 тыс. рублёў. Лік ... дасягае ў сучасны момант 13 ... час як летась дасягаў толькі 8 ... лавек. Значная праца праробна ... ве рацыяналізацыі каапэрацыі ... Цэрабкопа. У сучасны момант ... прыступіў да пабудовы хлебо... горадзе.

Саматужная і жыльлёвая каа... па гэтых галінах таксама ... дасягненьні. Напрыклад, па ... каапэрацыі лік арганізацый ... за апошні год у два разы супроць ... лага году. Паявы капітал ... варыст. таксама значна павялічыўся ... проць мінулага году. За апо... значна палепшыўся сацыяльны ... матужных арцеляў. Кватэрная ... цыя ахапіла сабою 85 проц. ... тэрнага камунальнага фонду, ... да сябе рабочых і іх сродкі ... тысяч рублёў. На новае будаў... траціла 685 тысяч рублёў. Кват... апэрацыя шырока разгарнула ... будаўніцтва ў горадзе, пабудава... радзе больш 200 кватэр і ў ... пені аднавіла стары кватэрны фонд.

Свае дасягненьні каапэрацыя ... надалей замацоўваць і дабівацца ...

А. Дамбр...



У мэханічным цэху (Завод „Энэргія").

Працоўныя яўрэі на зямлі.

(Полаччына).

—Дзе-ж гэта відана, каб яўрэі ды працавалі на зямлі. Іх прыродныя заняткі—гандлярства і спэкуляцыя,—так думалі і разважалі некаторыя сяляне Экіманьскага сельсавету, Полацкага раёну. Толькі не спадабаліся гэтыя сялянскія разважаньні Мэндалю Кадакову. Ён бачыў сьвет, быў у Нямеччыне, некалькі гадоў працаваў у багатага абшарніка на гаспадарцы. Агні Кастрычнікавай рэвалюцыі прывабілі яго на бацькаўшчыну з Нямеччыны.

Праз некалькі гадоў пасьля прыезду яго на Полаччыну, Мэндаль Хадакоў задумаў арганізаваць сельска-гаспадарчую арцель. Думку сваю яму удалося ажыцьцявіць 7-га мая 1923 году, калі ён з сямі бядняцкіх яўрэйскіх сем'яў стварыў арцель пад назваю „СРТ". Дзяржава пашла насустрач працоўным яўрэям. Арцель атрымала сорак пяць гэктараў зямлі, (з гэтага ліку 24 гэктары пахаці, шэсьць гэктараў сенажаці, 4 з паловай гэктары саду, які налічвае 510 дрэў і інш. Набылі касілку, каштоўнасьцю у 120 рублёў, жнейку—за 250 рублёў, дыскавую барану, пяць плугоў, усяго інвэнтару закупілі на суму каля пяці тысяч рублёў. З гэтым арцель пачала працу.

— Нічога з іх ня выйдзе,—разважалі некаторыя сяляне і тут-жа дадавалі, няма чаго рабіць, раз каапэрацыя насела на шыю гандляру, дык яны і кінуліся на такую махінацыю.

— Глядзі, Мэндаль, ты-ж яшчэ касы ня ўмееш трымаць так, як трэба, а ўжо за сельскую гаспадарку ўзяўся—падпускаў жарты які-небудзь селянін пры пакосе.

— А ты не клапаціся пра мяне—самаўпэўнена адказваў Мэндаль, і яшчэ з большым запалам прымаўся за пачатую працу, маючы надзею на будучыну.

Асабліва здружыўся Мэндаль з Ліўшыцам, які таксама меў жаданьне заснавацца на зямлі разам з другімі. Ліўшыц яшчэ да прыезду на Полаччыну два гады працаваў у Віцебскай акрузе ў савгасе. Мэндаль з Ліўшыцам мелі адны ідэі калектыўнай працы, адны думкі і гэта іх яднала, набліжала аднаго да другога.

Адразу-ж арцель пачала расьці і ўзмацняцца. Належным чынам абсталявалі будынкі, прывялі ў парадак сад, каля будынкаў на чорнай ураджайнай глебе заклалі гарод, прыцягнулі да працы агранома. А самае галоўнае—адчувалася дружнасьць, арганізованасьць па ўсіх членаў арцелі. Адгэтуль зьяўлялася самаўпэўненасьць пры выкананьні тэй альбо іншай працы. Кожны арцельшчык баяўся, каб яго не палічылі лодырам, не адставаў ад другіх і працаваў колькі мог.

Мінула некалькі гадоў. Завялі культурны дагляд за жывёлаю. Выгадавалі 8 добрых каней, 18 кароў і шэраг іншай дробнай жывёлы. Дойныя каровы арцелі „СРТ" лічацца лепшымі ва ўсей Полацкай акрузе. Кожны год збываемае арцельшчыкамі малако дае арцелі прыбытку звыш 700 рублёў.

Упартая праца арцельшчыкаў дае належныя вынікі. Характэрным паказацелем гэтага зьяўляюцца ўраджаі. Вось узорныя лічбы:

Ураджаі з дзесяціны: жыта ў арцелі—95 пудоў, бульбы—1000 пудоў, вікі на 300 пудоў больш, чым у сялян, канюшына—на 200 пудоў больш і г. д. Адным словам лічбы гавораць самі за сябе. Апроч гэтага асаблівых посьпехаў дасягнулі арцельшчыкі наладзіўшы добры дагляд за гародам. Кожны год яны атрымліваюць з дзесяціны гароду па 2500 пудоў буракоў, па 2700 пудоў капусты. У мінулым годзе, напрыклад, капуста ў сялян зусім не ўрадзіла, для яе не было спрыяючых умоў, а для арцельнага гароду ніякая пагода не пашкодзіла: арцельшчыкі дабіліся адпаведнага ўраджаю пры дапамозе сталага нагляду за гародам, пры дапамозе выкананьня агранамічных парад.

Ад гэтага і зьмяніўся погляд на пачынаньні арцелі ў акалічных сялян. Сяляне сталі паважаць арцельшчыкаў, сталі вучыцца ў іх. У гэтым годзе арцель наведала 40 экскурсій з мэтаю азнаямленьня з жыцьцём арцелі.

Масавая праца за апошнія часы таксама шырока разгортваецца. Выпісваюцца розныя нацыянальныя газэты, часопісі. Мясцовы №-скі полк трымае з арцельшчыкамі сувязь. Арганізуюцца сумесныя вечары. Арцельшчыкі наведваюць чырвонаармейцаў. а яны наадварот—арцельшчыкаў.

Зараз арцельшчыкі паставілі ва ўсю шырыню пытаньне аб разьвіцьці гароднiцтва і жывёлаводзтва, што ў іх умовах зьяўляецца самай лепшай формай вядзеньня сельскай гаспадаркі.

Арцельшчыкі пераможуць. Гэта ясна і зразумела.

С. Міхальцоў і Т. Хадкевіч.

Авіяхім---да дню 11-га ліпеня.

(г. Ворша).

10 ліпеня Аршанская арганізацыя Авіяхіму прыме шчыры ўдзел у правядзеньні сьвяткаваньня гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў—11 ліпеня. У гэты дзень па акрузе будуць агледжаны і прыведзены ў парадак магілы чырвоных партызан і чырвонаармейцаў, загінуўшых у барацьбе за Савецкую Беларусь. Будзе таксама праведзена прада па адзначэньню гэрояў, загінуўшых у барацьбе, шляхам вывешваньня памятных дошак, патрэтаў і баявых жыцьцяпісаў. Адначасова будзе зроблена ўшанаваньне мясцовых партызан, прымаўшых удзел у змаганьні за Савецкую Беларусь.

Разам з гэтым будуць праводзіцца вечары ўспамінаў, інсцэніроўкі, спаборніцтвы вайсковыя, гульні, у горадзе стралковыя спаборніцтвы паміж асобнымі ячэйкамі. Усе ячэйкі ў гэты дзень павінны будуць на сходах падагуліць вынікі сваёй працы і правесьці вярбоўку новых сяброў у шэрагі авіяхіму.

А. К.

Будуем нацыянальныя калгасы.

(Магілеўская акруга).

Акрамя старога польскага калгасу «Чырвоны Ратай», арганізаваны яшчэ два новыя польскія калгасы.

У вёсцы Хрыпаёва—с.-г. арцель імя Дзяржынскага, з пераважваючым бядняцкім складам. З 19 двароў, якія ўваходзяць у калгас, 7 двароў ня маюць ні рабочае, ні малочнае жывёлы, 3 двары—зусім беспасеўныя.

Другі калгас—імя Домбаля—утварыўся ў Бялыніцкім раёне на плошчы 122 гэктары.

Існуе ў акрузе **інтэрнацыянальны калгас „Дружба"**, у якім працуюць палякі, беларусы і яўрэі.

Сёлета ў акрузе арганізаваны 1 латыскі і 1 літоўскі калгас.

Яўрэйскіх калгасаў існуе 38 на плошчы каля 4.500 гэктараў.

Квік.

Новая фабрыка хлеба.

(Калгас „Чырвоны Ма[як]").

У вёсках Дзюдзева, Хрэнава, Шу... Боркі разгарнулася шырока пра... земляўпарадкаваньню. З 23-х сялян... гаспадарак на іх зямлі і на зямлі ... занай ад поўпрацоўных гаспадар... ўсяго на плошчы 1.000 гэктараў, ар... зован калгас „Чырвоны Маяк".

Большасьць памянёных гаспадарак ... райшлі працаваць у калгас.

16 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі ў калгас заявы з просьбай ... прыёме іх у калгас.

Калгас тэрмінова земляўпарадкоў... ца. У асеньня-пасяўную кампанію ... праведзен пасеў і перадача ў калгас ... гасьнікамі ўсёй маёмасьці.

Трэба адзначыць энэргічную і ... працу па арганізацыі гэтага калгасу ... каморнікам т. Сівяшковым, які дзень ... цуе на полі, а вечарам праводзіць ... рокую растлумачальную працу з нас... ніцтвам, асабліва сярод беднаты, аб ... чэньні калгаснага будаўніцтва.

М. Сакалоўск...

Грэскі р., Меншчына.

ТРАКТАТЫ І САПРАЎДНАСЬЦЬ.

Сёньня, калі ўпрыгожаная чырваньню сьцягаў вольная Савецкая Беларусь сьвяткуе 9-ю гадавіну свайго вызваленьня, кінем погляд туды, за межы і паглядзім, як жывуць нашы браты—працоўныя Заходняй Беларусі.

Калі Заходняя Беларусь апынулася пад уладаю Польшчы, праўнае становішча яе насельніцтва было акрэсьлена цэлым шэрагам унутрана-польскіх і міжнародных актаў і трактатаў. Самым яскравым з гэтых актаў зьяўляецца падпісаны паміж Польшчай і дзяржавамі Антанты трактат аб нацыянальных меншасьцях. Трактат складзен вельмі добра і ажыцьцяўленьне яго артыкулаў гарантуе Заходняй Беларусі ўсе магчымасьці эканамічнага, нацыянальнага і культурнага разьвіцьця.

„Абарона жыцьця, свабоды і маемасьці ўсіх польскіх грамадзян бяз розьніцы нацыянальнасьці"—урачыста гаворыць 2 артыкул трактату. Але якім зьдзекам і якім цынізмам зьяўляецца гэты артыкул на справе.

Перада мною—„Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм". Кожная старонка, кожны радок гэтых інтэрпэляцый струменіць гарачай крывёй, з кожнага слова льлюцца сьлёзы і чуюцца скаргі і стогны шматпакутнага беларускага працоўнага народу.

„У памяшканьне селяніна вёскі Гічыцы, Боркавіцкай гміны, Астапа Мінчука—65 гадоў,—гаворыцца ў інтэрпэляцыі,—прышлі два паліцыянты і запыталіся: „дзе маеш карабін?" На адмоўны адказ Мінчука паліцыянт пачаў зьбіваць яго кастэтам, пакуль Мінчук ня ўпаў, страціўшы прытомнасьць»...

«Да гаспадара Кірыла Куранчыка»,—гаворыцца далей,—«прышлі каля 1-й гадзіны ўночы, таксама шукаючы карабіны. Выцягнуўшы Куранчыка ў поле, павалілі яго на зямлю і пачалі біць жалезнымі прутамі па пятах, прыводзячы ў прытомнасьць вадою, калі самлее. Пасьля экзэкуцыі Куранчыка паўжывога адвезьлі на пастэрунак.

Адначасова з біцьцём у пацярпеўшых адбіралі хлеб, масла, вэндліну, павыкідвалі з гумнаў збожжа і перавярнулі ўсё ў памяшканьні.

У канцы студзеня 1925 году жаўнэрамі 10 баону пагранічнай варты быў арыштаваны селянін вёскі Сыгевічы, Радашкоўскай гміны, Вялейскага павету, Антось Вайтовіч. Арыштаваны быў накіраван на пастэрунак 10 баону ў м. Красным, дзе над ім было ўчынена нячуванае катаваньне. Вайтовічу нанесена 35 цяжкіх ран; яму, жывому чалавеку, пушчалі кроў, катавалі і білі, пакуль няшчасны не сканаў у руках катаў. Ужо астылы труп жаўнеры аддалі сялянам на пахаваньне. Жонка не магла перанесьці гэтага ганебнага забойства і памерла, пакінуўшы 2-х дзяцей сіротамі.

Перад вялікаднем 1925 году сяляне в. Брыскаўшчына, Нясвіскага павету, Лаўрэн Лях, Адам Лях і Юльлян Шостак вэндзілі ўвечары каля хаты вэндліну. У гэты час падышоў патруль і, скамандаваўшы—„рукі ўгару, лажыся па зямлю", пачаў стралянину па ляжачых людзях. Кулямі быў сьмяротна паранены селянін Лаўрэн Лях: 2 кулі прастрэлілі яму нагу і адна прайшла праз грудную клетку. На крык Ляха выскачыла яго жонка і брат Міхась Лях, якіх жаўнеры зьбілі прыкладамі стрэльбаў. Раненага Ляха ўнесьлі ў хату, а Адама Ляха і Шостака арыштавалі. У хуткім часе Лаўрэн Лях памёр па дарозе ў бальніцу".

„Ад 30-У да 9-УІ г. г. у вёсках Пацавічы, Малькавічы, Асаўмяны, Боркі, Самуйлавічы, Ліхнічы, Зальвяне, Калядзічы і інш. вёсках Пескаўскае гм., Ваўкавыскага павету, адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод беларускіх сялян. Вобыскі не далі ніякіх рэзультатаў; ня гледзячы па гэта арыштавалі 75 асоб, па абвінавачваньні ў камунізьме.

На гэтую оргію прыехала цэлая армія паліцыі і дэфэнзывы ў мундзірах. І вось распачалі катаваньні і зьдзекі над невінаватымі і безабароннымі людзьмі. Сярод гэтых катаў асабліва вызначыўся п. Абручоў. Ён і яго калегі-каты білі людзей да страты прытомнасьці, пасьля адлівалі іх вадою і тады, зьвязаўшы ім рукі і ногі і працягнуўшы паміж лакцей і каленаў шаблю, улівалі ім у нос мешаніну наступнага складу: вада, воцтавы квас, соль і камфорны сьпірытус. Потым прымушалі, каб ахвяры гэтыя прызнаваліся да таго, чаго жадалі каты, а хто не прызнаваўся—зноў білі".

„Уноч з 27 на 28 красавіка г. г. на абшары Кобрынскага пав. былі зроблены масавыя арышты сярод беларускага і яўрэйскага насельніцтва. У гэты час былі арыштаваны 41 чал.

Так званы допыт паліцыя рабіла ўначы, дзеля чаго брала па аднаму з арыштаваных і адводзіла ў асобную камору. Там, зьвязаўшы катаванаму разам рукі і ногі, працягнуўшы паміж імі кій, паліцыянты білі свае ахвяры кіямі ў пяты, таўклі нагамі ў бакі, вырывалі з галавы валасы, улівалі ў нос горка-салёную ваду і наогул рабілі г. зв. допыт такім самым спосабам, які практыкуецца цяпер у Польшчы і перад якім бляднеюць усе спосабы зьдзеку і катаваньняў людзей, якія толькі бачыў сьвет.

Усяго гэтага для кобрынскай паліцыі было мала, таму закавалі ахвярам рукі і таптапі іх і білі нагамі; вырадкі-паліцыянты плявалі катаваным у твар.

У часе гэтага допыту, каб заглушыць крыкі і енкі, накідалі ахвярам на галовы кажухі і затыкалі ім рот анучамі і, апрача таго тыя з паліцыянтаў, якія мелі здольнасьць да музыкі, ігралі на бандуры і пялі".

«20 верасьня 1925 г. дзяржаўная паліцыя ў Слоніме арыштавала Панасеню Кандрата, жыхара вёскі Савічы, Шылавіцкай гм.

Таго-ж самага дню яго адвялі ў экспэртызу палітычнай паліцыі ў Слонім, дзе і пачаўся допыт, злучаны з бязьлітасным біцьцём. Выканаўцамі гэтай экзэкуцыі былі два п'яныя выведнікі. Пасьля **звычайнага** біцьця рэвальвэрамі пашлі спэцыяльныя спосабы: ахвяру падвесілі на моцна завязаных назад руках і білі па твары да страты прытомнасьці; калі ахвяра прыходзіла ў прытомнасьць, зьдзекі ішлі далей. Здымалі вопратку і валаклі па зямлі; паміж пальцамі ўкладалі алоўкі і ламалі пальцы; рашчынялі жалезам рот і ўлівалі ваду; паміж пальцамі закладалі і падпальвалі анучкі і паперу, абмочаную ў нафце; калолі голкай цела, змушалі хрысьціцца перад польскім гэрбам, прывязвалі шнуром за палавыя ворганы і цягнулі ўгару, а калі ахвяра пачынала крычаць, адзін з выведнікаў наступаў на горла і душыў і г. д.».

„На Дамініканскай вул. а 6 гадзіне ўвечары быў арыштаваны Карнаус Ян, жыхар Горадні, і адпраўлены ў камісарыят дзяржаўнай паліцыі. На другі дзень жонка, жадаючы наведацца да мужа, пашла ў вышэйпамянёны камісарыят.

Дзяжурны паліцыянт пасьля доўгіх адмоў, што нібыта такога Карнауса ў камісарыяце ня было, нарэшце сказаў, што гадзіну таму назад Карнаус павесіўся, а труп яго адвезьлі ў мясцовы шпіталь. Атрымаўшы такую вестку, заклапочаная кабета разам са сваім знаёмым Уско Арсенам, які пражывае на Тэатральнай вул., пад № 11, зараз-жа накіравалася ў шпіталь, дзе ў трупярні і знайшла труп свайго мужа. Аднак, ніякіх сьлядоў ад павешаньня ня было; заўважала толькі сіняк на левым віску".

Не, не магу, сіл няма чытаць далей жудасныя радкі...

„Замацаваць за беларусамі права закладаньня прыватных школ і выхаваўчых установ, дабрачынных і грамадзкіх інстанцый,—каб навука ў гэтых школах выкладалася на роднай мове і каб усялякія гэтыя нацыянальнасьці мелі аднолькава права карыстацца дапамогаю з боку дзяржаўнага бюджэту" — езуіцкі цынічна гавораць п. п. 8-9 трактату.

А ў сапраўднасьці «яшчэ ў верасьні 1923 году,—чытаем у інтэрпэляцыях, на жаданьне жыхароў в. Малькевічы, Мікалаеўскае гміны, Дзісьненскага павету, гмінная рада пастанавіла адчыніць у вёсцы Малькевічы беларускую школу. Але, ня гледзячы на тое, што жыхары ўжо не адзін раз зьвярталіся да школьнага інспэктара, школа да гэтага часу не адчынена. Таксама стаіць справа з адчыненьнем беларускай школы ў вёсцы Дубоўка, Лускай гміны: замест беларускай там адчынена польская школа, у якую прымушаюць пасылаць беларускіх дзяцей.

У вёсцы Возерка, Мірскай гміны, Несьвіскага павету, існавала ў працягу 2 год беларуская пачатковая школа. У 1921 годзе школьная ўлада выслала настаўніка на курсы «паляністыкі», а беларускую школу перарабіла ў польскую. Новы настаўнік ня ведае беларускай мовы і дзеля большага поспеху ў навуцы па просту б'е дзяцей.

Т-ва беларускай школы ў Радашкавічах адчыніла прыватную школу ў в. Пруды, Дзеравенскай гміны, Слонімскага павету. Аднак, слонімскі староста загадаў паліцыі зачыніць школу і настаўніцы казаў узяць падпіску, што яна ня будзе навучаць у беларускай школе.

* * *

Доўгай бясконцай стужкай льлецца з радкоў інтэрпэляцыі шэраг ганебных зьдзекаў над элемэнтарнымі правамі культуры і чалавецтва. Я прывёў толькі некалькі фактаў, якія зафіксаваны ў інтэрпэляцыі. Але колькі гвалтаў, колькі зьдзекаў не дашлі да ведама грамадзкасьці.

І сёньня, у дзень нашага сьвята, у дзень падагуленьня нашых вялікіх дасягненьняў на гаспадарчым і культурным фронце, шлём шчырае братэрскае прывітаньне нашым братом рабочым і сялянам Заходняй Беларусі і іх правадыру камуністычнай партыі, якая вядзе працоўныя масы да вызваленьня з пад ярма фашызму.

Няхай сёньня яшчэ зьдзекуюцца паны, але заўтра, прыгожае радаснае заўтра, будзе нашым.

С.

НА ВАРЦЕ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

11-га ЛІПЕНЯ—СЬВЯТА ПРАЦОЎНЫХ, ДАСЯГНУТАЕ ЎПАРТАЙ БАРАЦЬБОЙ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.—СЬВЯТКУЮЧЫ РАЗАМ З ПРАЦОЎНЫМІ, РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ СВАЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ДЛЯ АДПОРУ ЎСЯКІХ СПРОБАЎ ПАРУШЫЦЬ НАШУ МІРНУЮ ПРАЦУ.—У ДЗЕНЬ СЬВЯТА ЎШАНУЕМ ПАМЯЦЬ ЗАГІНУЎШЫХ ЗМАГАРОЎ, ПЕРАДАМО ІХ ТРАДЫЦЫІ МАЛАДОМУ ПАКАЛЕНЬНЮ.

Вайна з белапалякамі ў 1920 г.

Згодна даных нашай разьведкі ,сілы праціўніка перад арміямі Заходняга фронту налічвалі 86.400 штыкоў, 7.500 шабляў, 188 лёгкіх і 77 цяж. гармат.

Супроць гэткіх сіл арміі Заходняга фронту 1-га ліпеня мелі: 90.509 шт., 6.292 шаблі і 595 гармат розных калібраў.

Так і чынам, Заходні наш фронт быў, увогуле, роўны па сілах белапалякам.

З раніцы 4 ліпеня часьці Чырвонай арміі перайшлі ў рашучае наступленьне; Мазырская група ў гэты час пашырала сваё далейшае наступленьне, абкружаючы раку Іну.

У працягу цэлага дня 4-га ліпеня на ўсім фронце арміі Заходняга фронту мелі значны посьпех; нашы часьці праследавалі праціўніка ў адкрытым полі.

Уноч з 6 на 7 ліпеня ня менш пасьпяхова часьці № арміі акружалі р. Бярэзіну і адразу выйгралі значны пляц на яе заходнім беразе.

Надламаны ўдарамі нашых армій польскі фронт бязупынна адыходзіў да лініі старых нямецкіх пазіцый. На пазіцыях у раёне м. Паставы і воз. Мядзіол праціўнік у працягу 2 сутак (8 і 9 ліпеня) затрымліваў прасоўваньне часьцей № арміі, пакуль, урэшце, яны ня былі прарваны пры дапамозе іншых часьцей Чырвонай арміі.

На р. Віліі часьці праціўніка зрабілі спробу затрымацца; такім чынам, затрымаўся і правы фланг № арміі на мяжы старых нямецкіх пазіцый ад воз. Вішнеўскага да р. Віліі і далей да м. Смаргонь.

На ўсім-жа астатнім фронце нашы арміі пасьпяхова пасоўваліся наперад, і галоўныя сілы № арміі да канца дня 11-га ліпеня аўладалі раёнам Маладэчна і г. Менскам. Захопленыя ў Менску часьцямі № арміі апэрацыйныя загады IV польскай арміі сьведчылі, што праціўнік ня страціў надзеі ўтрымацца на поўдзень ад Вільні на мяжы старых нямецкіх пазіцый. Ня гледзячы на тое, што пазіцыі гэтыя, асабліва ў раёне Баранавіч, зьяўляліся вельмі моцнымі, яны не маглі поўнасьцю выканаць сваё прызначэньне, бо № армія ўжо абкружала іх і знаходзілася на подступах да г. Вільні.

На гэтых пазіцыях праціўнік абараняўся асабліва ўпарта. Аднак ужо раніцой 14 ліпеня часьці IV арміі ўступілі ў г. Вільню.

Становішча белапольскіх войск моцна ўскладнілася яшчэ тым, што літоўскія вайсковыя часьці, якія да гэтага часу былі нэйтральны, выступілі і занялі чыгуначную ст. Ландварова і Новыя Трокі. Белапольскія войскі распачалі сьпешнае адступленьне ў напрамку на г. Ліду.

Арміі Зах. фронту далей разьбівалі праследаваньне белапалякаў і да канца дня 17 ліпеня шчыльна падышлі да мяжы старых нямецкіх акопаў, дзе завязаліся ўпартыя баі, асабліва на вучастку XVI арміі; аднак, праціўнік толькі суткі пратрымаўся на гэтым рубяжы і ўжо к канцу дня 19 ліпеня арміі Зах. фронту вышлі на мяжу р. Нёмана, ст. Баранавічы, ст. Лунінец, прычым 3-ці конны корпус заняў Гародню.

Рашучыя посьпехі Чырвонай арміі зрабілі ўплыў на дыплёматыю Антанты, якая пачала лічыцца з савецкай уладай.

Перамога працоўных, вызваленьне Беларусі ад панскага ўціску дасягнута магутнай сілай і ўпартай барацьбой Чырвонай арміі. Чырвоная армія ў гэты дзень разам з усімі працоўнымі сьвяткуе сваю перамогу.

К. М.

ІМЁНЫ ЗАГІНУЎШЫХ ГЭРОЯЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ ПАВІННА ВЕДАЦЬ УСЯ КРАІНА.

Кожны год 11 ліпеня, дзень вызваленьня БССР ад белапольскіх банд, уваскрашае ў памяці працоўных тыя зьдзекі, якія цярпелі беларускія працоўныя масы ад пана Пілсудзкага. У гэты дзень працоўныя БССР павінны падагуліць вынікі таго, што зроблена для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. Кожная ячэйка ТДА-Авіяхіму павінна праверыць свае сілы, падагуліць дасягненьні, прыняць крокі, каб іх замацаваць надалей; адзначыць недахопы, каб іх у далейшым выправіць.

Дзень 11 ліпеня асабліва ўваскрашае ў памяці кожнага працоўнага БССР. Сьветлыя імёны лепшых загінуўшых гэрояў грамадзянскай вайны. Гэты дзень павінен стаць днём ушанаваньня і ўвекавечаньня іх памяці. І тут вялізарнейшая роля належыць нізавым ячэйкам ТДА-Авіяхіму. Але гэта справа ня толькі ячэек ТДА-Авіяхіму,—гэта справа прафсаюзных, шэфскіх, камсамольскіх і піянэрскіх арганізацый. Іх дзеяньні, жыцьцё, змаганьне, самаахвярная сьмерць за ідэалы працоўных павінны стаць прыкладам для нашай усёй працоўнай моладзі. Лепшыя старонкі іх гэройскай гісторыі павінны быць вядомы ўсёй краіне. Нашы школы павінны выхоўваць сваіх вучняў на яскравых прыкладах гэтых, без пары загінуўшых за справу рабочае клясы барацьбітоў. Хай найвышэйшым жаданьнем кожнага вучня будзе пайсьці па яго шляху, аддаць сябе за справу працоўных усяго сьвету.

Як-жа канкрэтна распачаць гэтую вялікую справу? Папершае, усім мясцовым арганізацыям і ў першую чаргу ячэйкам ТДА-авіяхіму прывесьці ў парадак брацкія магілкі; далей—у хатах-чытальнях, нардамох, школах, клюбах, сельсаветах вывесіць памятныя дошкі, партрэты з кароткай біяграфіяй загінуўшых гэрояў тэй мясцовасьці. Дзе дазваляюць умовы—пабудаваць помнікі. Назваць імем гэрояў калгасы, саўгасы, школы.

Г. Віна градаў.

З кулямётам—на ворага

Баявыя традыцыі №-га Чырвонаштандартнага стр. палка

№ Чырвонаштандартны стралковы полк накіроўваецца на Заходні фронт разам з брыгадай у той час, калі пачалося наступленьне легіёнаў Пілсудзкага. 9-га ліпеня 1920 г. брыгада наступае. Фарсіруючы раку Бярэзіну, часьці брыгады удачнымі манэўрамі захапілі станцыю Асіповічы. Гэтым яны садзейнічалі часьцям дывізіі захапіць бяз бойкі горад і крэпасьць Бабруйск, загнаць у Асіповіцкі тупік 2 бронецягнікі, якія ворагам былі ўзарваны. Лепшыя пазнанскія палкі беглі пад ударамі брыгады. Запаленыя плухільным жаданьнем перамогі, чырвонаармейцы з магутным запалам „даёш Варшаву“ рухаліся ўперад па шляху Слонім, Брэст-Літоўск, Седзельцы, Варша. З парадзеўшымі радамі брыгада падыйшла да Варшавы. Вораг аказаў упартае супраціўленьне. У працягу 4-х дзён брыгада адбівала палкія атакі праціўніка, з боку якога былі ўведзены шмат арудзьдзя і бронецягнікі.

Агульныя абставіны, якія склаліся да гэтага моманту, прымусілі брыгаду, як і ўсе часьці арміі Заходняга фронту, пачаць адступленьне. Уначы на 18-га жніўня брыгада пачала свой адыход.

Арганізавана ў поўным парадку, адыходзілі і часьці брыгады. У раёне гораду Беластоку брыгада аказалася ў кальцы ворага. Брыгада рухнулася ў напрамку да Беластоку. Супраціўнік з усіх бакоў павёў атаку, але нашы перадавыя часьці, прарваўшы кальцо, аслабанілі шлях для брыгады, якая і злучылася са сваімі часьцямі. Пасьля шэрагу сутычак з ворагам, брыгада застанавілася ў раёне м. Радашковічы, 11 кастрычніка вораг вялікімі сіламі адціснуў нашы часьці, 12 кастрычніка, часьці, якія знаходзіліся на правым флангу, павялі наступленьне на супраціўніка, дзеля ўстанаўленьня страчаных месц. Брыгада падтрымлівала, але з прычыны маруднасьці суседніх часьцей, зрабіўся прарыў на працягу 10 клм. Вораг, скарыстаўшы няўдачны момант, кінуў свае сілы ў прарыў, разагнаў штаб брыгады, пашоў далёка ў тыл да часьцей брыгады, якія знаходзіліся на пазіцыі, і заняў м. Радашковічы, дзе знаходзіўся палітштабдзіў. Камбрыг загадаў часьцям згуртавацца ў раёне Аляхновічы, дзе было рашана абавязкова прарваць фронт ворага праз Радашковічы, які быў заняты польскай кавалерыяй. Пачалася падрыхтоўка. Часьці брыгады рушылі.

У выніку гэтай апэрацыі брыгады, супраціўнік лічыў, што мае справу з вялікімі сіламі і адцягнуў часьці назад, гэта ратавала становішча нашай № арміі і быў папярэджан удар на сталіцу Беларусі гор. Менск. Так скончыўся апошні акорд барацьбы на польскім фронце.

Янка Лашкевіч.

Ад бізуна—да волі.

(УСПАМІНЫ).

Жнівень 1919 г. Пад націскам панскага войска прымушана была адступіць змучаная Чырвоная армія, пакідаючы на панскія зьдзекі і расправу рабочых і сялян.

Верасень 1919 году. Гор. Слуцак даўно заняты польскімі панамі і іх прыслужнікамі. Зноў загаварыў панскі бізун на сьпіне працоўных. Але рабочы і селянін былі ўжо ня тыя пакорныя—яны пакаштавалі волі і зноў жыцьцём ці сьмерцю хочуць вярнуць яго.

Асеньні дзень. Сёньня яўрэйскае рэлігійнае сьвята «судны дзень». Усе ўстановы і прадпрыёмствы зачынены. У горадзе цішыня. Толькі адны маліцьвенныя дамы запоўнены: туды сабраліся «дзельцы» маліцца за грахі.

На краю гораду маленькі рух: па аднаму, хаваючыся, падыходзяць маладыя хлапцы да маленькага доміка і асьцярожна ўваходзяць туды. Гэта камсамольцы зьбіраюцца на першы арганізацыйны сход. На сход зьявіўся чалавек у студэнцкай вопратцы,—інструктар ЦК.

У кароткай інфармацыі ён абмаляваў становішча на фронце і задачы працы. Пытаньняў няма—усё ясна: за працу, на барацьбу, за вызваленьне Беларусі ад панскага бізуна.

Прайшоў некаторы час. Барацьба разгарэлася. Спаленыя вёскі, тысячы абяздоленых, бяспрытульных сялян кідаюць астаткі скарбу, уцякаюць у лясы, арганізуюцца. Горад аказваў дапамогу: кіраваў, пасылаў свае лепшыя сілы—камуністаў, камсамольцаў, заклікаў усіх на барацьбу.

Красавік 1920 году. Горад у стане аблогі. Польскай дэфэнзыве ўдалося выкрыць нараду партызанаў. Турма перапоўнена. Паламаныя рукі, зьбітыя да паўсьмерці людзі запаўняюць камэры турмы.

Нядзеля, 23-га красавіка. Сонечны дзень. У горад наехала многа сялян. Раптам крык: «Вядуць». Абкружаныя пяхотаю і кавалерыяй, зьбітыя, з павязанымі рукамі ідуць 14 лепшых сыноў працоўных на сьмерць. Катаваньні і чаканьне сьмерці іх не зламала: яны ішлі, высока падняўшы галовы. Кожны з гэтых ахвяр парываўся сваёй сьмерцю даць прыклад, заклікаць працоўных да яшчэ больш рашучай барацьбы. І гэта ім удалося. Панская расправа, лепш чым усякая агітацыя, паказала працоўным „дэмакратызм і культуру“ паноў. Моманты нацыянальнай варожасьці ляцелі прэч. Разам з беларусамі гэройска паміралі пяць салдат польскай арміі—удзельнікі падпольнага камуністычнага руху. Працоўныя Беларусі—яўрэі, палякі, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяй змагаліся разам, сядзелі разам у турме, разам зносілі катаваньні.

Прывялі на магілкі, выстраілі ў шарэнгу, абкружылі...

— Таварышы, мы паміраем, але спадзяёмся, што наша пераможа. Няхай жыве суссьве...“—апошнія словы паміраючага абарваў залп. Яны ўмярлі гэроямі.

У турме засталося шмат. Дэфэнзыва працавала бесьперапынна, а разам з ею—палявы суд. Штодзённа выводзілі людзей з турмы невядома куды. У менскай турме сядзела 1300 чалавек, з іх добрая палова—удзельнікі падпольнага камуністычнага руху. Арыштаваныя памірыліся з сваім лёсам і чакалі моманту, калі можна будзе або гэройска памерці, або зноў кінуцца ў змаганьне.

Ліпень 1920 году. Менск зашумеў зноў. «Адважныя» войскі Даўбор-Мусьніцкага ляцелі, як мячыкі, пад націскам магутнай Чырвонай арміі. Паны зьбіраліся ў паход «усур'ёз і надоўга».

Г. Скакальскі.

Барацьба ў ангельскім парляманце

Рэзалюцыя кансэрватараў адхілена галасамі рабочай партыі і лібэралаў.

ЛЁНДАН, 9-8. Кансэрватары падалі рэзалюцыю, якая выказвае ўраду недавер'е за тое, што ён ня можа дакладна вызначыць сваёй палітыкі ў пытаньні аб ахоўваючых і розных іншых мытах, а таксама ў пытаньні аб прынцыпах «імпэрскае перавагі» (ахоўваючымі называюцца ў Англіі мыты, па хадайніцтву той ці іншай галіны прамысловасьці па падставе закону аб ахове ангельскае прамысловасьці; прынцып «імпэрскае перавагі» складаецца з таго, што тавары, пераважна, харчовыя, прадукты і сыравіна, якія прывозяцца з аднае часткі Брытанскае імпэрыі ў другую, абкладаюцца зьменшанымі мытамі ці вызваляюцца ад мытаў).

У спрэчках наконт гэтай рэзалюцыі міністр фінансаў Сноудэн сказаў; «Прынцып імпэрскае перавагі быў памылковым і нездаровым. Нельга карыстацца ім, не абкладаючы мытамі харчовыя прадукты і сыравіну, якія прывозяцца з заграніцы. Урад зусім не зьяўляецца прыхільнікам такога парадку. Рабочая партыя выразна заявіла, што мыты будуць скасаваны і ніхто не павінен дзівіцца, калі ў чарговым дэкрэце гэтыя мыты ня будуць прадугледжаны.

Таксама, калі міністр гандлю падасьць папраўку да законапраэкту аб скасаваньні прымусовых мытаў, дык ён зробіць гэта з поўным правам. Я спадзяюся, што ўрад рабочае партыі скасуе мыты на цукар, сушоную садавіну і ўсе наогул харчовыя прадукты; разам з гэтымі мытамі зьнікне, натуральна, і так званая «імпэрская перавага».

Пры галасаваньні рэзалюцыі, пададзенай кансэрватарамі, яна была адхілена большасьцю 340 галасоў рабочае партыі і лібэралаў проці 220 галасоў кансэрватараў.

КЛОПАТЫ АНГЕЛЬСКАГА ЎРАДУ.

ЛЁНДАН, 9-7. Урад пастанавіў, што пытаньне аб рэформе выбарчых правоў павінна абмяркоўвацца ў спэцыяльнай парляманцкай камісіі, у якой будуць прадстаўлены ўсе партыі.

Міністру няма часу.

ЛЁНДАН, 8-7. Міністр па справах Індыі Бэн адхіліў просьбу сакратарыяту камітэту абароны міруцкіх зьняволеных аб прыняцьці дэлегацыі па пытаньнях, зьвязаных з міруцкім працэсам дзеячоў індыйскага прафруху.

Індыя--проці Макданальда.

БЭРЛІН, 8-7. „Бэрлінэр Тагеблят“ зьмяшчае пад загалоўкам „Індыя проці Макданальда“ паведамленьне свайго карэспандэнта з Сімлы, у якім зазначана, што першая заява Макданальда па пытаньні аб Індыі зрабіла няспрыючае ўражаньне ў Індыі.

Матылял Нэру ў гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што «прамова прэм'ера да несправядлівасьці дадае яшчэ зьнявагу». Абыход моўчкі Індыі ў троннай прамове таксама зрабіў, водлуг слоў карэспандэнта, няспрыючае ўражаньне, якое яшчэ пагоршылася пасьля ўхваленьня камісіі Саймону.

Плян Юнга выбіў Эўропу з раўнавагі.

Францыя шукае кампрамісу.

ПАРЫЖ, 9-7. Водлуг вестак друку, францускі адказ на ангельскую ноту высоўвае кампрамісную прапанову па пытаньні аб парадку працы палітычнае рэпарацыйнае канфэрэнцыі. Згодна гэтае прапановы, „перамовы павінны праводзіцца раўналегла пры дапамозе трох розных органаў“.

Пры гэтым францускі ўрад прапануе наступныя органы: пленарную канфэрэнцыю для абмеркаваньня рэпарацыйнага пытаньня, у якой павінны ўдзельнічаць 6 зацікаўленых дзяржаў (г. зн. Англія, Францыя, Бэльгія, Італія, Японія і Нямеччына), а таксама Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Грэцыя і Партугалія; камісію экспэртаў, якая падрыхтоўвае вырашэньне «тэхнічных пытаньняў», зьвязаных з ажыцьцяўленьнем плянаў Юнга; спэцыяльны камітэт, які складаецца з прадстаўнікоў з 6-ці зацікаўленых дзяржаў і які павінен „вывучыць“ пытаньне аб спыненьні акупацыі і аб кантролі ў Рэйнскай вобласьці.

* * *

ПАРЫЖ, 9-7. Палата дэпутатаў назначыла на сераду спрэчкі па пытаньні аб ратыфікацыі згоды Мэлён-Бэранжэ.

Англія адхіляе прапанову камісіі экспэртаў.

ЛЁНДАН, 9-7. Сноудэн, адказваючы ў палаце вобшчын на запытаньні, зададзеныя яму наконт пляну Юнга, заявіў: „Можна сказаць, што ў выніку ажыцьцяўленьня пляну Юнга Францыя і Італія будуць карыстацца ізноў перавагаю здаваленьня з рэпарацыйных выплат, якія будуць выплачвацца Нямеччынаю. Англія ні ў якой меры не абавязалася прыняць прапанову камісіі экспэртаў; гэтая прапанова будзе абмяркоўвацца на надыходзячай міжнароднай канфэрэнцыі.

Ангельскі ўрад высоўвае асноўны прынцып, згодна якога Францыя павінна будзе таксама зрабіць адпаведную па разьмерах выплату ў пагашэньне свайго доўгу Англіі. Урад сочыць з вялікаю зацікаўленасьцю за спрэчкамі, якія адбываюцца ў Францыі аб згодах і даўгох. Пры належных варунках урад будзе дамагацца ажыцьцяўленьня высунутага ім прынцыпу“.

Антысавецкі блёк на поўначы.

ЛЕНІНГРАД, 9-7. Гэтымі днямі ў Біёрку (Фінляндыя) прыехаў швэдзкі адмірал Лудэк з камісіяй з некалькіх марскіх афіцэраў. Швэды аглядалі крэпасьць і цікавіліся станам узьбярэжнае абароны і флётыліі шуцкораў. Водлуг вестак, некаторыя фінскія манэўры пройдуць пад наглядам швэдзкае камісіі.

Як вядома, штогоду фінскія манэўры, якія адбываюцца, так сказаць, ля брамы Ленінграду, дэманструюць дэсант ля Выбаргу і адпор шуцкораўскай флётыліяй наскоку на шхэры. Цікава зазначыць, што Швэдыя зьмяніла сваю пасыўную марскую палітыку. Лінкор „Сверыгэ“ пераўзброен, пабудавана 8 падводных лодак спэцыяльна для шхэр, будуецца 2 авіяносцы. Гэта наводзіць на думку аб канцэнтрацыі марскіх сіл паўночных дзяржаў проці СССР.

Правакацыі паліцыі з мэтай сарваць забастоўку.

ВЕНА, 9-7. Водлуг паведамленьня з Сафіі, прадпрыёмцы спрабуюць сарваць забастоўку тэкстыльшчыкаў у Сьлівэрне, ня спыняючыся ні перад якімі сродкамі. Так, напрыклад, гэтымі днямі правакатары кінулі бомбу ў памяшканьне аднэй з фабрык, каб даць паліцыі прычыну да новых арыштаў бастуючых пад прыкрыцьцем «тэрарыстычнага замаху». Не зважаючы на ўсё гэта, бастуючыя цьвёрда праводзяць далей барацьбу.

РАБОЧЫ РУХ.

Братаньне матросаў з рабочымі.

БЭРЛІН, 8-VII. Водлуг паведамленьняў з Амстэрдаму, у гарадку Каандам мела месца братаньне між нямецкімі рэвалюцыйнымі матросамі з экіпажу нямецкага параходу „Дыяна“ з галяндзкімі рабочымі. Матросы і рабочыя наладзілі супольную дэманстрацыю. Паліцыя разагнала дэманстрантаў, пусьціўшы ў ход гумовыя дубінкі і халодную зброю. Шмат дэманстрантаў паранена. Арыштавана шмат галяндзкіх рабочых, у тым ліку некалькі камуністаў.

* * *

ВЕНА, 8-VII. У зьвязку з падрыхтоўкаю да 1-га жніўня на аўстра-югаслаўскай мяжы адбудзецца братэрскае спатканьне аўстрыйскіх і югаслаўскіх рабочых.

Дзейнасьць камітэту барацьбы з фашызмам.

БЭРЛІН, 8-7. Міжнародны камітэт па барацьбе з фашызмам агаласіў адозву, у якой заклікае рабочых і сялян, рэвалюцыйную інтэлігенцыю, прыгнечаныя калёніяльныя народы і нацыянальныя меншасьці да барацьбы проці фашызму і ваеннае небясьпекі. Адозва зазначае, што рэакцыя ўзмацнілася ва ўсіх капіталістычных краінах, калёніях і паўкалёніях. Нават так званыя дэмакратычныя дзяржавы робяцца адкрытаю апораю рэакцыі.

Да канфэрэнцыі барацьбы з імпэрыялізмам.

БЭРЛІН, 8-7. 20-га ліпеня ў Франкфурце на Майне адбудзецца першая міжнародная канфэрэнцыя моладзі па барацьбе з імпэрыялізмам і калёніяльным прыгнечаньнем. На парадку дню канфэрэнцыі такія пытаньні: 1) задачы працоўнае моладзі ў барацьбе проці імпэрыялістычнае вайны (дакладчык Барбюс); 2) становішча рабочае і вучнёўскае моладзі ў калёніях і дзейнасьць нацыянальна-рэвалюцыйных арганізацый моладзі; 3) задачы працоўнае моладзі Эўропы і Паўночнае Амэрыкі ў пытаньні аб падтрыманьні вызваленчае барацьбы калёніяльных народаў.

Забастовачны рух ахапіў усю Румынію.

ВЕНА, 9-7. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, забастовачны рух у Румыніі пашыраецца. Гэтымі днямі абвешчана забастоўка на вагона-будаўнічым заводзе Уніён у Стамары і на адным буйным лесапільным заводзе ў Чарнавіцах. Бастуючыя патрабуюць увесьці 8-мігадзінны дзень працы і павялічыць заработак. Апроч таго, абвешчаны забастоўкі на некаторых прадпрыёмствах горнае, тэкстыльнае і лесапільнае прамысловасьці ў Сяміградзьдзэі.

Імкненьні Польшчы да Данцыгскага порту.

БЭРЛІН, 8-VII. «Дэйтшэ Альгэмэйнэ Цэйтунг» паведамляе аб назначэньні польскім урадам палкоўніка Яцыніча сябром польскае дэлегацыі ў камітэце Данцыгскага порту. Газэта разглядае гэты факт, а таксама пядаўняе назначэньне францускага генэрала Лерона старшынёю праўленьня данцыгскае суднабудаўнічае вэрфі, як новы доказ мілітарыстычных імкненьняў Польшчы ў адносінах да Данцыгскага порту.

Польскі ўрад затрымаў запрашэньне.

БЭРЛІН, 8-7. На канфэрэнцыі, якая адбываецца зараз у Жэневе, па перaглядзе згоды аб частковым разброеньні, адсутнічаюць прадстаўнікі ад Данцыгу. Запрашэньне было паслана Данцыгу праз польскі ўрад, які затрымаў яго з прычыны, нібыта, таго, што Данцыгу, які ня мае арміі, няма чаго рабіць на канфэрэнцыі.

ЦЯЖКІ ПЭРЫЯД У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.

Гісторыя Беларусі—гэта гісторыя аднаго з самых пакутных народаў. Яна «пестрит» у мінулым крывавымі падзеямі, эксплёатацыяй працоўных, сацыяльным і нацыянальным уціскам і прыгнечаньнем іх. Аднак, калі праз усю гісторыю Беларусі праходзіць чырвонаю ніткаю сацыяльнае і нацыянальнае прыгнечаньне працоўных мас, то ў апошнюю польскую акупацыю гэта прыгнечаньне і катаваньне дасягнула свайго апагея. Гэты пэрыяд інакш нельга назваць у гісторыі Беларусі, як пэрыядам ліхалецьця.

Кастрычнік беларускаму працоўнаму народу даў волю, даў фабрыкі, даў зямлю. Зьнішчана сацыяльнае і нацыянальнае прыгнечаньне, якое панавала вякамі на тэрыторыі Беларусі. Рабочыя і працоўнае сялянства дружна, з энтузіязмам узяліся за працу па адбаўленьню гаспадаркі, па ўзьняцьцю культурнасьці мас пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі. Працоўныя Беларусі не чакалі, што Польшча, якая сама толькі што адрадзілася, пасягне на захоп чужой тэрыторыі. Аднак, здарылася гэта.

Ня гледзячы на цэлы шэраг прапаноў Савецкага ўраду аб вырашэньні спрэчных пытаньняў мірным шляхам, польская буржуазея разам з сваімі лёкаямі ППС, ахопленая імпэрыялістычным зудам, бязупынна ўхілялася ад мірных перагавораў. 2 студзеня 1919 г. адбываецца зьверскі расстрэл агэнтамі тагочаснага польскага ўраду савецкай місіі Чырвонага Крыжу, а затым паступова воласьць за воласьцю, павет за паветам захапляецца белапольскімі легіёнамі беларуская тэрыторыя. 8-га жніўня 1919 году сталіца Беларусі Менск апынулася ў руках польскага гэнэрала Шэптыцкага. Савецкі ўрад 22 сьнежня 1919 г. і 28 студзеня 1920 году фармальна—афіцыйна прапанаваў Польшчы заключыць мір, але польскі ўрад на гэту прапанову нічога не адказаў, і польскія вайсковыя часьці, не абмяжоўваючыся прасоўваньнем на тэрыторыі Беларусі і Літвы, пачынаюць прасоўваньне і на украінскім фронце.

11-га мая 1920 г. польскія войскі занялі Кіеў. Гэты факт выклікаў ня толькі сярод польскай буржуазеі, але і сярод польскіх „сацыялістаў“ вялікую радасьць. Адна з газэт ППС „Трыбуна“ пісала так: „Польскія арлы ў Кіеве. Польская армія заняла лінію Дняпра“... Ад балтыйскага да Чорнага мора падае пад ударамі польскай арміі двухвяковая расейская магутнасьць. Што расейская шабля завявала, тое польская вызваляе. У гэтым заключаецца глыбокі сэнс перамог польскага аружжа“.

Ад „Трыбуны“ не адстаў і другі орган ППС «Напшуд», які разбойнічы набег на тэрыторыю Беларусі і Украіны называў «адзінай у сваім радзе вайной за вызваленьне суседніх народаў» і „вынікам далёкабачнай(?) палітыкі Пілсудзкага“. Праўда, гэта палітыка была не асабліва „далёкабачнай“, бо ўжо 7-га чэрвеня польскім войскам трэба было падмазваць пяткі салам і ўцякаць з Кіеву пад націскам Чырвонай Арміі, але тут трэба было адзначыць другое,—гэта шалёна-патрыятычны тон прэсы сацыял-здраднікаў і вельмі вольнае жангліраваньне гістарычнымі фактамі.

У часе акупацыі белапалякамі Беларусі польскім урадам было выдадзена шэраг адозваў да насельніцтва. Пасьля заняцьця Менску ў канцы жніўня выдаецца абвяшчэньне, у якім чорным па беламу напісана так: „усякая прыватная ўласнасьць, ці будзе яна награбленай, ці мо прыпадкова знаходзячаяся ў незаконных уласьціцеляў, павінна быць безадкладна зьвернута. Уласьціцелі зямельнай маетнасьці, альбо іх праваможныя намесьнікі змушаюцца да 10-га чэрвеня прыняць у сваё уладаньне зямельную маетнасьць“.

Такі загад „прыняць у свае ўладаньне маетнасьці“ не заставіў доўга чакаць паноў-земляўласьнікаў, фабрыкантаў—буржуазею. Як крумкачы сталі зьлятацца на Беларусь, пасьля таго, як выкінуты былі рэвалюцыйнай хваляй Кастрычніка з сваіх цёплых гнёзд. Пачалася жорсткая, бязьлітасная расправа паноў і буржуазеі з рабочаю клясаю і працоўным сялянствам, якія захапілі ў сваё ўладаньне землі, фабрыкі, заводы, словам, усё тое, што заваёвана было крывёю іх у дні Кастрычніка. У маёнтках зьявіліся паны, на фабрыках і заводах—буржуазея. Пашлі даносы, вобыскі, арышты. Шомпал, бізун і турма для працоўнага народу сталі звычайным зьявішчам. Толькі і чулася па Беларусі „дваццаць пеньць“,—гэта дваццаць пяць шампалоў ці бізуноў рабочаму, селяніну, інтэлігенту, словам, усім тым, хто быў супроць акупантаў-паноў і буржуазеі.

Пры ўступленьні ў Менск польскі ўрад выдаў адозву ад імя пана Пілсудзкага, у якой адзначана; „Хацеў-бы бачыць гэты край (Беларусь—Я. М.) вольным паміж вольнымі народамі“; што-ж належыць да ўзаемаадносін з Польшчаю, то Беларусь будзе гаварыць з ёю „як роўны з роўным і вольны з вольным“. Рабочая кляса і працоўнае сялянства Беларусі добра памятаюць, як белапольскія акупанты гаварылі з імі, як „роўны з роўным і вольны з вольным“.

Адразу пасьля захвату польскай арміяй гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі, утвараліся жандармскія пастэрункі. Гэтыя пастэрункі зьяўляліся месцам катаваньня камуністаў, рабочых, сялян, якія імкнуліся арганізаваць пралетарскую сыстэму дзяржаўнасьці. Пачаўся шалёны шпіяпаж, правакацыя, паляваньне за ўсімі тымі, хто хоць трошкі спачуваў саветам. Досыць было якому-небудзь пану ці падпанку паказаць на чалавека пальцам, што гэта бальшавік, як гэтага чалавека ставілі „да сьценкі“ і расстрэльвалі.

Асабліва перанесла шмат катаваньняў і зьдзекаў яўрэйская пралетарская маса ў гарадох і мястэчках, а таксама батрацкая і бядняцкая частка сялянства ў вёсках.

Поруч з сацыяльным уціскам пачаўся і нацыянальны ўціск. Лёзунг „роўны з роўным“ і „вольны з вольным“ стаў ажыцьцяўляцца такім чынам, што ўсьлед стаў насаджвацца зьвярыны каталіцка-польскі шавінізм. Зьявілася цэлая хмара ксяндзоў. З крыжам і маўзэрам, пры дапамозе рэлігіі і паліцы сталі разлагаць рабоча-прафэсыянальны рух, даючы каталіцкім саюзам розныя прывілеі.

Лёзунг „роўны з роўным і вольны з вольным“ надзвычайна яскрава адбіўся ў школьнай палітыцы акупантаў. Досыць сказаць, што амаль усе беларускія школы былі ў гэты час зачынены. Тое-ж самае зараз робіцца і ў Заходняй Беларусі.

У адказ на сацыяльны і нацыянальны ўціск, на зьдзекі, катаваньні пачынаецца рух сярод рабочых і сялянства супроць акупантаў. Камуністычная партыя шырока разгортвае працу ў горадзе і вёсцы, з кожным днём папаўняе свае шэрагі рабочымі, сялянамі і працоўнай інтэлігенцыяй. Поруч з агітацыяй сярод працоўных мас ідзе падрыхтоўка да паўстаньня, каб дапамагчы Чырвонай арміі вызваліць Беларусь ад белапольскай акупацыі. Сьледам за камуністычнай арганізацыяй разгортвае сваю дзейнасьць і камсамольская арганізацыя. Арышты паасобных партыйцаў, камсамольцаў, беспартыйных барацьбітоў не прыпыняюць падпольнай працы. Пасылаўся ў турму адзін склад падпольшчыкаў кіраўнікоў руху рабочых і сялян—на іх месца высоўваліся новыя кадры, і праца працягвалася бязупынна.

Кампартыя развівала працу ў прафсаюзах, дзе прыходзілася сустракацца з апартуністычнымі партыямі: бундам, поалей-цыон і інш. Паступова крок за крокам заваёўваюцца саюзы; бунд, яго лепшая частка, прымае камуністычную афарбоўку, утвараецца беларуская падпольная арганізацыя, праграма якой зусім супадае з праграмаю кампартыі. Адначасова з пашырэньнем дзейнасьці камуністычных арганізацый у горадзе ідзе праца па арганізацыі працоўнага сялянства ў вёсцы. У выніку працы камуністычных арганізацый вырастае паўстанскі рух супроць акупантаў, які з асаблівай сілаю выбухае ўвясну 1920 г.

Паміж камуністычнай партыяй, сапраўдным кіраўніком і змагаром за сацыяльна-нацыянальнае вызваленьне мас Беларусі і белапольскімі акупантамі, путаліся пад нагамі так званыя „беларускія дзеячы найвышэйшай рады“, якія перашкаджалі сацыяльна-клясавай рэвалюцыі і інтэрнацыянальнаму руху пралетарска-сялянскага вызваленьня.

На паўстаньні рабочых і сялян акупанты адказвалі сваім жорсткім тэрорам, але ні бізуны, ні шомпалы, ні турмы, ні расстрэлы, ні агітацыя клерыкалаў, ні здрадніцкая палітыка «найвышэйшай рады» не маглі затрымаць шырокай хвалі паўстаньняў працоўных мас.

У хуткім часе з-за Бярэзіны пачалося шырокім фронтам наступленьне Чырвонай арміі. Разьдзетая, разутая, галодная, слаба ўзброеная Чырвоная армія магутным, гэраічным, рэвалюцыйным парывам нанесла ворагу паражэньне. Хутка шырокаю лавінаю пачала адкатвацца белапольская армія. Зноў прышоў вялікі Кастрычнік, па гэты раз ужо назаўсёды. 11 ліпеня 1920 году сталіца Савецкай Беларусі Менск быў вызвален ад белапольскіх легіёнаў, ад жандармэрыі, ад пастэрункаў. Разам з белапольскімі легіёнамі пачалі ўцякаць паны, фабрыканты, якія ўжо пачалі было эксплёатаваць працоўныя масы Беларусі.

Рэвалюцыйны ўздым Чырвонай арміі прывёў яе пад сьцены Варшавы. Пасьля буржуазея, ксяндзы і ППС зрабілі ўсё магчымае, каб распаліць самую дзікую варожасьць насельніцтва Польшчы супроць Чырвонай арміі. Асабліва ў гэтых адносінах выдзелілася ППС. У партыйнай прэсе і на сходах пачаліся агіднейшыя нацыяналістычныя оргіі. «Рабочы народ! Таўчы маскалёў, як гадаў. Іх трупамі ўсьцілай зямлю»! Вось якую „рэвалюцыйную песьню новага пралетарскага гімну“ павінен быў сьпяваць „рабочы полк абароны Варшавы“. Такі гімн быў надрукаваны ў органе ППС «Работнік».

Вайна з Польшчаю пасьля 2 з палавінай гадоў бязупыннай крывавай бойкі з другімі імпэрыялістычнымі дзяржавамі і ўнутранай контр-рэвалюцыяй была вялізарнейшаю бядою. Але разбойнічы напад Польшчы прымусіў узяцца за аружжа.

По Рыскаму дагавору да Польшчы адышла значная колькасьць беларускіх і украінскіх зямель, у якіх польская народнасьць займае зусім нязначную меншасьць. Рыскі мір у поўнай меры ажыцьцёвіў захопніцкія мэты нацыянал-дэмакратаў і ліквідаваў дробна-буржуазныя фэдэралістычныя ілюзіі ППС.

Пасьля вызваленьня Менску ад белапалякаў 1 жніўня 1920 г. была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі. У выдадзенай дэклярацыі гаворыцца: „Злучаная Беларусь пры дапамозе Чырвонай арміі завяршае справу свайго вызваленьня. Цяпер рабоча-сялянскі народ Беларусі можа выявіць сваю волю. Арганізаваны рабочы кляс і працоўнае сялянства—Камуністычная Партыя Літвы і Беларусі, Беларуская Камуністычная арганізацыя, агульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд) і Цэнтр. Бюро Прафсаюзаў г. Менску і Менскай губэрні, грунтуючыся на волі працоўных мас, выяўленай на I Зьезьдзе Саветаў Беларусі ў лютым 1919 г. у шэрагу рэзалюцый, у поўнай згодзе з Чырвонай арміяй і Рэвалюцыйным Ваенным Саветам Заходняга фронту імем паўстаўшых рабочых і сялян правазглашаюць незалежную Савецкую Рэспубліку Беларусі». „Яшчэ раз пацьвярджаецца, што права прыватнай уласнасьці на зямлю касуецца назаўсёды».

З гэтага часу пачалося сацыялістычнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі.

Яз. Мацюкевіч.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

6-га ліпеня 1929 г. пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ВЫНІКАХ ДАСТАСАВАНЬНЯ АМНІСТЫІ, АБВЕШЧАНАЙ У АДЗНАКУ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ БССР, ДА ВАЙСКОВА-СЛУЖАЧЫХ.

Заслуханы даклад Народнага Камісарыяту Юстыцыі БССР аб выніках дастасаваньня амністыі, абвешчанай у адзнаку дзесяцігодзьдзя БССР, у адносіне да вайскоўцаў.

Вынікі дастасаваньня амністыі да вайскоўцаў наступныя: усяго па амністыі аслабанена 92 чал., з якіх: рабочых—13, сялян—54, служачых—2, вайскоўцаў—23; паменшана пакараньне на палову 124 чал.; зьнята паражэньне ў правох з 1 чал.; спынена спраў на 5 чал.; аслабонена з гаўптвахты зьвызволеных у дысцыплінарным парадку—18 чал.; аслабонена ад іншых відаў дысцыплінарнага пакараньня—155 чал.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў даклад аб выніках дастасаваньня амністыі прыняць да ведама.

ПРА ВЫНІКІ ПЕРАДАЧЫ ВЫХАВАНЦАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ У ПРАЦОЎНЫЯ ЗЕМЛЯРОБСКІЯ ГАСПАДАРКІ.

Заслуханы даклад Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям пры ЦВК БССР пра вынікі перадачы выхаванцаў дзіцячых дамоў у працоўныя земляробскія гаспадаркі для падрыхтоўкі іх да сельска-гаспадарчай працы, у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК БССР за 23-II-1928 г. па гэтым пытаньні.

З дакладу выявілася, што мэтад перадачы дзяцей у сялянскія сем'і на выхаваньне слаба практыкуецца на мясцох.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў даручыць Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям, Наркамасьветы, Наркамфіну і Наркамзему пры перадачы дзяцей на выхаваньне ў працоўныя земляробскія гаспадаркі імкнуцца перадаваць іх у першую чаргу ў калектыўныя гаспадаркі, а таксама і саўгасы; даручыць Акрвыканкомам у двухмесячны тэрмін праверыць як выконваецца пастанова ЦВК і СНК БССР, вывучыць усе станоўчыя і адмоўныя зьявішчы пры выкананьні гэтага закону і аб выніках паведаміць Прэзыдыуму ЦВК.

ПЛЯН ПРАЦЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР НА ДРУГУЮ ПАЛОВУ 1929 ГОДУ.

Зацьверджан плян работы Прэзыдыуму ЦВК БССР на другую палову 1929 г. У пляне прадугледжана праверка ўжытых мерапрыемстваў па выкананьні пастаноў IX Усебеларускага Зьезду Саветаў, Юбілейнай Сэсіі ЦВК БССР, а таксама заслухоўваньне розных дакладаў па асноўных галінах палітычнага і культурна-гаспадарчага жыцьця Рэспублікі і савецкага будаўніцтва.

ПРА ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ БССР.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра зьмену пастановы ЦВК і СНК БССР за 10 кастрычніка 1924 г. „Пра Ордэн Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР".

Згодна гэтае пастановы, асобы, нагароджаныя Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР, маюць такія самыя льготы, як і гэрої працы.

АБ КАМІТЭЦЕ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ЗЬЛЁТУ ПІАНЭРАЎ.

Зацьверджан Камітэт пры Прэзыдыуме ЦВК БССР садзейнічаньня правядзеньню Ўсебеларускага зьлёту піанэраў у наступным складзе: т. т. Чарвякоў (Старшыня), Хацкевіч, Ігнатоўскі, Стасевіч, Сянкевіч, Баліцкі, Барсукоў, Платун, Лямпер, Кулікава, Паўлідовіч, Шаліма, Рывін, Карачун, Цішка Гартны, Буклей, Янка Купала, Шэніна, Русецкі, Крэмер, Лакцыёнаў, Ашаровіч.

АБ КУРСАХ СТАРШЫНЬ І САКРАТАРОЎ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Прэзыдыум ЦВК, заслухаўшы хадайнічаньне Прэзыдыуму Магілеўскага АВК аб перанясеньні тэрміну правядзеньня курсаў старшынь і сакратароў сельсаветаў на верасень-кастрычнік месяцы, пастанавіў хадайнічаньне Прэзыдыуму Магілеўскага АВК адхіліць і прапанаваць яму правесьці курсы ў вызначаны тэрмін да пачатку масавых кампаній.

ВОДПУСКІ.

Прадастаўлен з 15-га ліпеня г. г. месячны водпуск Члену Прэзыдыуму ЦВК БССР—Загадчыку Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК БССР—тав. Дубаўцову.

На час водпуску тав. Дубаўцова абавязкі Загадчыка Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК БССР ускладзены на кандыдата ў Члены Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. Вараўка.

Не паслабляць увагі асеньняй сяўбе.

Практыка мінулых гадоў паказвае, што асеньняй пасеўнай кампаніі значна менш аддаецца ўвагі, чым вясеньняй, прычым яна ў значнай меры праходзіла „самацёкам". Праўда, час асеньняй сяўбы аб'ектыўна не асабліва спрыяючы, каб згуртаваць на гэтай кампаніі ўвагу усёй савецкай грамадзкасьці. Справа ў тым, што ў гэты час яшчэ фактычна праводзіцца ўборка ўраджаю, цэлы шэраг праходзіць іншых кампаній, аднак гэта ні ў якім разе не павінна адбіцца на належнай падрыхтоўцы і правядзеньні асеньняй сяўбы.

Трэба памятаць, асабліва нізавым савецкім органам і грамадзкім арганізацыям, што азімыя пасевы займаюць надзвычайна важнае месца ў вырашэньні зернавой праблемы, што пасьпяховае правядзеньне асеньняй пасяўной кампаніі дае значную ўпэўненасьць у тым, што мы ня будзем адчуваць недахвату ў хлебазагатоўках. Вось чаму ні ў якім разе недапусьцімы няўважлівыя адносіны да пасеву азімых, вось чаму неабходна, каб мясцовых партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і каапэрацыйныя арганізацыі згуртавалі максымум увагі на асеньняй сяўбе.

Якія асноўныя задачы стаяць у асеньнюю пасеўкампанію? Пашырэньне пасеўнай плошчы, далейшае пашырэньне сыстэмы аграмерапрыемстваў і далейшае разгортваньне працы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што мы ва ўмовах БССР адчуваем некаторы зямельны голад, а між тым усё-ж і ў нас можна значна пашырыць азімы клін. Мы маем вельмі шмат балот, хмызьнякоў, палянак, якія пры параўнальна невялікіх затратах сродкаў і сіл могуць павялічыць плошчу пад азімы клін. Трэба зараз-жа, дзе толькі магчыма, прыступіць да мэліарацыйных і карчавальных работ, каб пашырыць за кошт новых зямель плошчу азімага пасеву.

Другая задача—гэта ўзмацненьне і пашырэньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Гэтым пытаньнем трэба сыстэматычна займацца, але асаблівую ўвагу зьвярнуць на калектывізацыю, аграмаджаньне індывідуальных гаспадарак у час асеньняй сяўбы. Разам з стварэньнем новых калектываў, трэба ўзмацняць і ўзбуйняць існуючыя. Пашырэньне калгасаў ідзе так хутка, што мы нават не пасьпяваем іх арганізацыйна і гаспадарча абслужыць. Неабходна ў час асеньняй сяўбы парупіцца аб тым, каб калгасы, асабліва новыя, забясьпечыць сродкамі вытворчасьці, укараніць у гаспадарку прыёмы агратэхнікі, дапамагчы скласьці і ажыцьцявіць пляны севазваротаў і г.д.

Трэцяя задача, вельмі важная—гэта далейшае разгортваньне працы па ўзьняцьцю ўраджайнасьці. Вельмі важным мерапрыёмствам, якое можа даць значны эфэкт, зьяўляецца пасеў чыстагатунковым насеньнем і зернаачыстка. Пад чыстагатунковымі пасевамі мы маем неасабліва вялікую плошчу вось чаму неабходна надзвычайна ўважліва аднесьціся да збору гэтага насеньня і мэтазгодна скарыстаць як пасяўны матар'ял. Вялікая адказнасьць за збор і скарыстаньне гатунковага насеньня ляжыцца на сацыялістычны сэктар нашай сельскай гаспадаркі—саўгасы і калгасы. Рэч вядома, што зернаачысткі павінна быць аддадзена таксама належная ўвага, тым больш, што паміж уборкай ураджаю і сяўбою мы маем вельмі нязначную колькасьць часу.

Зразумела, што посьпех правядзеньня асеньняй пасяўной кампаніі будзе залежыць ад таго, як мы паставім працу па мабілізацыі актыўнасьці і сьвядомасьці рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. У гэтым напрамку трэба разгарнуць шырока масавую працу праводзячы сходы, вытворчыя нарады. Трэба палепшыць працу аграўпаўнаважаных, устанавіць больш цесную сувязь іх з аграномамі, ажыцьцяўляць кантроль над іх працаю з боку сельсаветаў, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, узяўшы канкрэтныя, зразумелыя для мас бядняцка-серадняцкага сялянства задачы.

Ня трэба забываць, што вакол правядзеньня гэтых мерапрыемстваў будзе ісьці клясавая барацьба ў вёсцы. Кулачко і падкулачнікі будуць імкнуцца ўсімі мерамі сарваць і не дапусьціць ажыцьцявіць гэтыя мерапрыёмствы. Вось чаму трэба паглыбіць і пашырыць працу па арганізацыі бедняты і прыцягнуць на яе бок усю серадняцкую частку вёскі.

Я. М.

ДАПАМОЖАМ БЕДНАЦЕ САБРАЦЬ І ЗАСЕЯЦЬ АЗІМІНУ.

У часе вясеньняй сяўбы па лініі сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі шырока разгарнулася працоўная і гужавая дапамога беднаце і падупаўшым гаспадарках. Па вестках толькі з 78 раёнаў БССР, было арганізавана 601 працоўная дружына, якія дапамаглі ў сяўбе 7438 гаспадаркам.

Зараз ЦК камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі яшчэ шырэй ставіць пытаньне аб дапамозе беднаце ў часе ўборкі ураджаю і сяўбы азіміны. Дзеля гэтага запрапанавана мясцом зрабіць поўны вучот усіх такіх гаспадарак, якія патрабуюць дапамогі, ужыць усе захады, каб ніводнага снапа, ні каліва сена не засталося ня ўбраным. Апрача шырокага разгортваньня арганізацыі працоўных дружын, ЦК КСУ прапануе аказваць дапамогу праз талаку, масавыя надзельнікі і г. д.

Значны ўдзел у аказаньні гужавой дапамогі павінны прыняць саўгасы і калгасы.

Каб даць магчымасьць маламоцным гаспадаркам справіцца оваечасова з сяўбою, пракатным пунктам дадзена дырэктыва падрыхтаваць да малацьбы малатарні і арфы. У першую чаргу трэба абмалаціць збожжа бядняцкіх і маламоцных серадняцкіх гаспадарак.

Прапануецца мясцом шырока ўжываць пры ўборцы ўраджаю і сяўбе азіміны форму супражкі коняй. Гэту форму трэба праводзіць выключна на падставе добраахвотнасьці і камплектаваць з бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, ні ў якім выпадку не дапускаючы да гэтага заможных і кулацкіх элемэнтаў.

Віды на ўраджай у БССР.

Водлуг даных Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, ва ўсіх акругах БССР на 1-га ліпеня віды на ўраджай здавальняючыя.

Мінулы месяц у мэтэоролёгічных адносінах быў ня зусім спрыяючым для росту расьлін. Быў час, калі тэмпэратура стаяла ніжэй нармальнай. Таксама назіраўся недахоп атмасфэрных ападкаў, асабліва ў 1-й і 2-й квадрах. Наогул, у чэрвені быў недахоп атмасфэрных ападкаў. Ня гледзячы на гэта, рост расьлін адбываўся здавальняюча.

Азіміна на 1-е ліпеня ў сярэднім па ўсёй БССР засталася стабільнай—3,2 бала (у параўнаньні з ацэнкай на 15-га чэрвеня). У некаторых акругах назіраецца нават некаторае палепшаньне, асабліва ў Гомельшчыне, Аршаншчыне і Полаччыне.

Калі-ж параўнаць ацэнку з мінулым годам на гэта чысло, дык сёлета маем падвышэньне на 0,3 бала.

Стан ярыны на 1-га ліпеня мае наступны выгляд: ячмень—3,0, авёс—3,0, пшаніца-ярушка—2,9, проса—2,7, грэчка—2,8, гарох—2,6, а ўся ярына агулам—3,0 бала.

Калі параўнаць з ацэнкай на 15-га чэрвеня, дык маем наступныя: авёс, ячмень і гарох засталіся стабільнымі, пшаніца-ярушка і проса даюць паніжэньне на 0,1 бала.

У параўнаньні з ацэнкай ярыны на гэтае-ж чысло ў 1928 г. сёлета ячмень дае падвышэньне на 0,8 бала, авёс—на 0,6 бала, пшаніца-ярушка і проса—на 0,5 бала.

Тэхнічныя расьліны таксама даюць палепшэньне: бульба—3,0, (летась 2,1), лён—2,9 (летась 2,3), каноплі—2,9 (летась—2,5).

Асабліва заўважваецца гэта палепшаньне ў параўнаньні з мінулым годам па травах: канюшына—3,5 супроць леташніх 2,6, віка—4,0 (летась 2,6), залўныя сенажаці—3,3 (летась 2,4), сухадольныя—3,1 (летась 2,6).

ХРОНІКА.

ПРЫВІТАНЬНЕ УРАДУ БССР.

Мы, грамадзяне вёсак Варацiна і Лысёнак, арганізавалі буйны калгас на надзельнай зямлі, на плошчы ў 300 гэкт., у ліку 25 двароў. Пачатую справу калектывізацыі абяцаем разгарнуць у сэнсе яе вытворчасьці і большага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Адначасова шлём шчырае прывітаньне і жадаем ЦВК хутчэй рэканструіраваць сельскую гаспадарку БССР, шляхам пераходу ўсіх індывідуальных гаспадарак на калектывізацыю і вытворчую каапэрацыю.

Няхай жыве Савецкі Урад і Ленінская кампартыя правадыры і кіраўнікі сацыялістычнага будаўніцтва.

АГУЛЬНЫ СХОД ВАРАЦІНСКАЙ С-Г. АРЦЕЛІ, РАСОНСКАГА РАЙЁНУ, ПОЛАЦКАЙ АКРУГІ.

У Прэзыдыуме Менскага АВК.

Трэба ўзмацніць тэмп торфараспрацовак.

Прэзыдыум Менскага АВК заслухаў даклад аб ходзе торфараспрацовак у Менскай акрузе. Да 1-га ліпеня ў акрузе здабыта 122200 куб. мэтр. торфу, што зьяўляецца недастатковым.

Прэзыдыум запрапанаваў АКРЗ'а ўжыць захады да ўзбуйненьня дробных т-ваў па торфараспрацоўках.

На наступны год дадзена заданьне скласьці карту ўсіх тарфянікаў акругі і здабыць ня менш 1000 тон.

Прэзыдыум АВК запрапанаваў усім РВК узмацніць працу па абслугоўваньню тарфяных распрацовак.

Сельскія суды сябе апраўдалі.

Прэзыдыум АВК заслухаў даклад старшыні менскага акрсуду аб дзейнасьці сельскіх судоў, якія зараз арганізаваны—па аднаму ў кожным раёне. Асабовы склад гэтых судоў наступны: 6,3 проц. батракоў, 45,1 проц. беднякоў, 37,8 проц. серадзякоў і 10,8 проц. служачых самагужнікаў.

Прэзыдыум АВК прызнаў працу гэтых судоў здавальняючай і карыснай.

Конкурс на лепшы с.-г. раён праходзіць слаба.

Прэзыдыум АВК прызнаў, што праца па правядзеньні конкурсу на лепшы с.-г. раён праходзіць нездавальняюча і марудна. Шэраг раёнаў зусім не адгукнуліся на гэта мерапрыемства. Справа гэта мала папулярызавана, і насельніцтва бадай што ня ведае аб задачах конкурсу.

Усім РВК запрапанавана шырока апавясьціць насельніцтва аб мэтадах конкурсу і прыступіць да складаньня апісаньня раёнаў.

Вылучэньне сялянкі на адказную працу.

Прэзыдыум АВК вылучыў сялянку т. Юшкевіч 2-м старшынёй акруговай зямельнай камісіі.

Дэлегацыя ЛКСМБ—на Украіну.

Для ўдзелу ў сьвяткаваньні 10-годзьдзя камсамолу Украіны ЦК ЛКСМ вылучыў дэлегацыю з трох чалавек, на чале з заг. аргаддзелу ЦК т. Шаліма.

Сьвяткаваньне 11-га ліпеня ў Менску.

Сёньня, а 12-й гадзіне ў дзень, накіроўваюцца ў „Чырвонае Урочышча" дэлегацыі ад прафсаюзаў.

А 6-й гадзіне ўвечары рабочыя дэлегацыі пойдуць на вайсковыя могілкі, дзе будзе арганізаваны мітынг на магілках барацьбітоў, загінуўшых за вызваленьне Беларусі. На мітынгу будуць выступаць з прамовамі т. т. Ігнатоўскі, Славінскі і Гурвіч.

Новы атрад бязбожнікаў.

(ВЫПУСК ЦЭНТРАЛЬНЫХ КУРСАЎ БЯЗБОЖНІКАЎ).

9-га ліпеня ў актавай залі Беларускага Камуністычнага Унівэрсытэту адбыўся ўрачысты выпуск цэнтральных курсаў бязбожнікаў.

З прывітаньнем ад АПА ЦК КП(б)Б выступіў т. Некрашэвіч.

—Рэлігія,—кажа тав. Некрашэвіч,—робіць вялікую перашкоду ў нашым сацыялістычным будаўніцтве і ў справе разгортваньня культурнай рэвалюцыі. Мы павінны перамагчы рэлігію і вырваць яе з гушчаў рабоча-сялянскіх мас. Гэтыя курсы зьяўляюцца фундамантам для нашых агітатараў на антырэлігійным фронце.

Прадстаўнік ячэйкі КП(б)Б Камвузу ў сваім прывітаньні сказаў, што мы павінны ўзброіцца марксыцкім вучэньнем для барацьбы з нашым ворагам—рэлігіяй.

Ад БДУ з прывітаньнем выступаў прафэсар Шчапоцьцеў.

У адказ на шматлікія прывітаньні курсант тав. Патапенка запэўніў, што курсанты набытыя веды цалкам аддадуць справе культурнай рэвалюцыі і на бязьлітасную барацьбу з клясавым ворагам—рэлігіяй.

Новы атрад ваяўнічых бязбожнікаў (54 курсанты) накіраваўся на фабрыкі, заводы і ў вёскі для рашучага наступленьня на рэлігійны дурман і на ўсю папоўшчыну.

Кіно „Інтэрнацыянал" „Напярэдадні".

Глядач доўга не разумее разгорт... падзей, якія паказаны ў фільму „На... рэдадні". Нарэшце, прыходзіць гл... і аб'вяшчае, што цар расейскі ... ну з японцамі.

Гэтыя прыёмы відавочна паказ... як нельга будаваць фільм з ... боку.

Між іншым можна дагадацца, ... прамінула вайна з японцамі, ... прамінула першая рэвалюцыя і ... рэакцыя.

І толькі з вялікай напруж... можна ўразумець, што „Напярэ... гэта ёсьць пярэдадне Кастрычні... для гэтага не патрэбен гарадані... пыя малюнкі вайны, разьбіваньне ... і іншая бэлібэрда, якой запоўн... нікому непатрэбны фільм.

СПРАВАЧНЫ АДД...

КАТЫРОЎКА ПАЗ...

НА 12-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Куп.
1-я 6 проц. залат. выігр. паз.	4.79,5
2-я 6 проц. выігр. паз.	5.00
Беспроц. выігр. пазыка 1926 г.	126.25
10 проц. дзярж. пазыка 1927 г.	26.20
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.57
3-я сялянск. выігр. паз. 27 г.	5.03
Дзярж. паз. Узм. сял. гасп.	10.53
12 проц. дзярж. унутр. 1927 г.	101.34
2-я 6 проц. паз. выігр.	26.76
Пазыка індустр.	26.00
11 проц. дзярж. унутр. пазыка 1928 г.	101.95
Пазыка 1929 г.	100.21

Часова вык. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС „ДЗЯРЖГАНДБЕЛ"

на 1-е кастрычніка 1928 году.

(Рэфарміраваны)

АКТЫЎ

НАЗВА ГРУП І РАХУНКАЎ	СУМА		Проц. аднос.
I. Маёмасьць:			
1. Будынкі і пабудовы	65269—32		
2. Інвэнтар і абсталяв.	98198—98		
3. Пабудовы і капіт. рамонт:			
а) няскончан. пабудовы	6900—90		
б) „ капіт. рамонт	5733—01	176103—21	1,14
II. Матар'ялы і абсталяв. па будаўніцтву.		15101—23	0,10
III. Удзел у іншых прадпрыем.			
1. Акцыі і паі		553224—75	3,57
IУ. Грашовыя сродкі.			
1. Каса ў саввалюце	1441—01		
2. Бягуч. рах. у саввалюце	201988—89		
3. Інвалюта ў касе	217—28		
4. Бягуч. рах. у інвалюце	1784—	205431—18	1,38
V. Каштоўныя паперы.		15678—60	0,10
VI. Тавары і матар'ялы.			
1. Тавары ўнутран. на складах	31920—49		
2. „ „ у дарозе	18451—65		
3. „ экспартн. на складах	1067244—84		
4. „ „ на каміс. загран.	2949173—94		
5. „ „ у дарозе	19050—20		
6. „ імпартн. на складах	241731—69		
7. „ „ у дарозе	25748—03		
8. Паўфабрыкаты	10268—75		
9. Матар'ялы і тара	251142—38		
10. Накл. выдат. па экспартн. тавар	211—53	4614943—46	29,77
VII Няскончан. вытворч. і перапр.			
1. Сыравіна і матар'ялы для вытворчасьці	13855—22		
2. Пераапрацоўка тавараў	3111—80	16967—02	0,11
VIII. Вэксалі і дакум. да атрым.			
1. Вэксалі ў партфэлі	425252—46		
2. „ у забесьпяч.	479578—40		
3. Вэксалі ўлічаныя	1311188—65		
4. „ на інкасо	7527—49		
5. Каштоўныя паперы	928—35	2224475—35	14,35
IX. Разьлікі:			
1. Пакупшчыкі	463361—83		
2. Дастаўшчыкі	975657—67		
3. Камісіянэры	202445—48		
4. Гандл. прадстаўн.	2118968—79		
5. Камітэнты	1256828—21		
6. Наркамфін па падат. і прыбыт.	26055 —		
7. Розныя асобы і ўстановы:			
а) па розн. разьліках	872424—98		
б) па будаўніцтву	206398 —		
8. Рабочыя і служачыя	3496—51	6125636—47	39,52
X. Няпэўныя даўжнікі:		34696—50	0,22
XI. Падсправаздачныя сумы:			
1. Падсправаздачн. асобы	51566—67		
2. Агэнтуры і агэнты	373100—90	424667—57	2,74
XII. Выдаткі па будаўніцтву:		24262—22	0,16
XIII. Няскончаныя разьлікі:			
1. Пакупка імпартн. тавар. заграніцай		56236—61	0,36
XIV. Выдаткі будучых год.		139954—09	0,90
XV. Страты мінулых год.		873107—43	5,63
Баланс		15500485—69	100
Унутран. разьлікі		1276304—47	—
Усяго		16776790—16	
За балянсам:			
1. Тавары камісійныя		54357—98	
2. Дэбітары па дадатк. забесьп.		2765380 —	
3. Забесьпячэн. атрыман.		775555—77	
		3595293—75	

ПАСЫЎ

НАЗВА ГРУП І РАХУНКАЎ	СУМА		Проц.
I. Капіталы прадпрыемства:			
1. Наркамгандаль па зваротн. фонду		2588470—39	
II. Фонды:			
1. Палепшаньне быту рабочых і служачых	463—47		
2. Спэцыяльн. прызнач.	1771—10	2234—57	
III. Рэзэрвы:			
1. На пагашэньне маёмасьці	43478—41		
2. Па недах. тавараў	30700—86		
3. На уцэнку тавараў	704594—16		
4. Па няпоўн. даўгох	34696—50		
5. „ прэтэнзіях	32680—10	846150—03	
IV. Бюджэтнае фінансав.:			
1. На будаўніцтва	538000 —		
2. „ павял. зварот. сродк.	119430 —	657430 —	
V. Доўгатэрмін. крэдыты:			
1. На будаўніцтва		125000 —	
VI. Кароткатэрмін. крэдыты:			
1. Спэц. бягуч. рахункі	2407415—69		
2. Ссуды кароткатэрм. цэлевыя	1062405—25		
3. Банкі па вучоту вэксал.	1311188—65	4781009—59	
VII. Вэксалі да плацяжу:			
1. Вэксалі выдадзеныя		2013615—01	
VIII. Разьлікі:			
1. Пакупшчыкі	135577—07		
2. Дастаўшчыкі	385324—24		
3. Камісіянэры	4037—63		
4. Гандл. прадстаўн.	2587034—93		
5. Камітэнты	415894—66		
6. Розныя асобы і ўстановы (па розн. разьлік.)	687308—08		
7. Рабочыя і служачыя	2162—60		
8. Пралангац. вэксал	21313—75		
9. Наліч. на пакр. накл. выд.	7785—94	4246438—90	
IX. Падсправаздачн. сумы:			
1. Падсправаздачн. асобы	881—61		
2. Агэнтуры і агэнты	3375—75	4257—36	
X. Няскончаныя апэрацыі:			
1. Пакупка тавараў у СССР	28217—06		
2. „ імпартн. тавар. заграніц.	21859—49	50076—55	
XI. Прыбыткі будуч. году		19507—14	
XII. Прыбыткі		166296—15	
БАЛЯНС		15500485—69	100
Унутраныя разьлікі		1276304—47	
УСЯГО		16776790—16	
За балянсам:			
1. Камітэнты па таварах		54357—98	
2. Абавязацельствы выдадзеныя		2765380 —	
3. Дэпаненты па забясьпеч.		775555—77	
		3595293—75	

Дырэктар-кіраўнік ШЭЙНІН. Галоўны бухгальтар ГУРЭВІЧ.

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ ЗА 1927-28 ГОД.

ДЭБЕТ (страты)

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума
1. Чыстыя страты ад продажу тавараў	953837—73
2. Агульныя гандлёвыя выдаткі	659915—15
3. Амартызацыя маёмасьці	11151—16
4. Дзяржпадаткі і мясцовыя зборы	172014—43
5. Выдаткі па крэдытн. апэрац. (проц. аплач.)	572131—58
6. Камісія аплачаная	111632—96
7. Недастача, выцечка і інш.	98525—20
8. Уцэнка дэфэктыўных тавараў	3824—67
9. Адлічэньні на ўтварэньне рэзэрваў	770547—50
10. Безнадзейныя даўгі	8278—33
11. Розныя выдаткі і страты:	
а) па апэрацыях бягучага году	375407—51
б) па апэрацыях да 1 кастрычніка 1927 году	7224—95
	3744491—17
Чысты прыбытак	166296—15
	3910787—32

КРЭДЫТ (прыбытак)

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума
1. Чысты прыбытак ад продажу тавараў	1271162—[illegible]
2. Камісія атрыманая	126344—[illegible]
3. Падаткі на крэдытн. апэрац. (проц. атрыман.)	300619—[illegible]
4. Лішкі	35673—[illegible]
5. Курсавая розьніца	16958—[illegible]
6. Дывідэнт па ўдзелу ў інш. прадпр.	1869—[illegible]
7. Рэзэрвы мінулых год	447901—[illegible]
8. Розныя прыбыткі:	
а) па апэрац. бягучага году	1634131—[illegible]
б) па апэрацыях да 1 кастрычніка 1927 году	76126—[illegible]
	3910787—[illegible]

Разьмеркаваньне прыбытку:

Чысты прыбытак разьмеркаваны наступным чынам:
Акрфа-папрыбытковы падатак 12 проц. — 19955—54
У аплату страты мінул. год — 146340—61 — 166296—15

Дырэктар-кіраўнік ШЭЙНІН — Галоўны бухгальтар ГУРЭВІЧ

Гэты баланс зацьверджан балансавай камісіяй пры Наркамгандлю СССР, згодна пратаколу № 12 ад 30-4—1929 г.

Старшыня ЛАМОЎСКІ — Сэкратар ГОЛЬДЗІН.

ТЭАТР—КІНО

ТЭАТР „ПРАФІНТЭРН"	Гастролі Маскоўскага 1-га рабочага тэатру Пралеткульта. Чацьвер, 11 ліпеня „Малиновое варенье" у 6 карц. Афінагенава. Білеты ў рабкасе і касе тэатру. Пачатак а 9 гадзіне.
КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА"	АД АЎТОРКА, 9-ГА ЛІПЕНЯ з прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень!!! 2-гі тыдзень!!! „ХВОІ ГАМОНЯЦЬ" Вытворчасьць Белдзяржкіно. Пач. сэансу роўна а 8 гадз. Каса адчынена ад 6 гадз.
КІНО-САД „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Савецкая № 71.	„КНЯЗЬ ЦЭРАН" Пачатак сэансу а 9 гадз. 15 хвілін. Каса а 7 гадзіне.
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".	МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „Напярэдадні" Драма ў 6 частках. Пачатак а 7 з пал. гадзіне.
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	„ЗА СЬЦЯНОЮ" Драма ў 7 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка Совкіно № 33.

ЦЫРК

СЁНЬНЯ—
ВЫКЛЮЧНАЯ Ў СЭЗОНЕ ПРАГРАМА
З УДЗЕЛАМ
НОВАПРЫБЫЎШЫХ ГАСТРАЛЁРАЎ
З прычыны грандыёзнай праграмы пачатак роўна а 9 гад. увечары.
ПА ЗАЯЎКАХ ФАБКОМАЎ і МЯСЦКОМАЎ—СКІДКА.

ГАНДЛЁВА-БУДАЎНІЧЫ ТРЭСТ

АБВЯШЧАЕ,

што на падставе пастановы Прэзыдыуму Менакрвыканкому
ГАНДЛЁВЫЯ ФУНКЦЫІ І МАГАЗЫНЫ БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ З 1 ЧЭРВЕНЯ ПЕРАДАДЗЕНЫ БЕЛПАЙГАНДЛЮ,
з прычыны чаго прапануецца ўсім установам і асобам, маючым да трэсту якія-небудзь прэтэнзіі па гандлёвай дзейнасьці, прад'явіць гэтыя да 15 ліпеня г. г.
Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

ДЫРЭКЦЫЯ ВЫСТАЎКІ

НАЗНАЧАЕ
НА ПАНЯДЗЕЛАК 15 ЛІПЕНЯ А 11 ГАДЗІНЕ РАНІЦЫ
ТАРГІ
на прадажу на знос жылых і нежылых драўляных будынкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі выстаўкі па Барысаўскаму шляху (на Камароўцы).
ТАРГІ АДБУДУЦЦА НА МЕСЦЫ.